ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 111 (4363)
ЧАЦЬВЕР, 19 мая 1932 г.

МЕНСК, Савецкая 51

СЕНЬНЯ Ў НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ — ПЕРАДАВЫ: Брыгада — цэнтральнае зьвяно ў барацьбе за сваячасовы пасеў тэхкультур.

Сталінскі паход за паляпшэньне рабочага снабжэньня (1 стар.).

ПАСТАНОВА ЦК УсеКП(б) ад 8 МАЯ 1932 ГОДУ — Аб разьвіцьці трусагадоўлі ў прамысловых раёнах Маскоўскай, Ленінградзкай і Іванава-Вазьнясенскай абласьцях (1 стар.).

Х. ДУНЕЦ — Аб майстрох пагромных спраў (2 стар.).

М. ДАШКЕВІЧ — Самазагатоўкі — важнейшая крыніца для грамадзкага харчаваньня (3 стар.).

Абвяшчаем усебеларускі конкурс на лепшае і хутчэйшае сканчэньне веснавой сяўбы (1 стар.).

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА — Выкрываньне буржуазнай сутнасьці ўсякіх прапаўдэньнаў шавінізму — адна з важнейшых умоў пасьпяховага ажыцьцяўленьня ленінскай нацпалітыкі (2 стар.).

Прыгарадны саўгас імя Дзяржынскага арганізаваў трусагадоўчую фэрму (3 стар.).

Правакацыйныя выдумкі лопаюцца адна за другой (4 стар.).

Брыгада—цэнтральнае зьвяно ў барацьбе за сваячасовы пасеў тэхкультур

У барацьбе за вырашэньне праблемы тэхкультур партыя за апошнія гады дабілася вялікіх посьпехаў. У выніку няўхільнага правядзеньня партыяй ленінскай палітыкі па перабудове вёскі па сацыялістычны лад, БССР ператварылася з адсталай дробна-селянскай акраіны царскай Расіі ў адзін з важнейшых раёнаў тэхкультур Савецкага саюзу.

Наколькі вялікі дасягненьні пралетарыяту і калгаснага сялянства ў гэтай галіне можна бачыць на фактах праведзенай работы за апошнія дватры гады. Даволі сказаць, што пасевы ільну і канапель узрасьлі са 153.000 га ў 1930 г. да 370.000 га ў 1932 г. Калі ў мінулым годзе мы мелі 27 МТС, дык у гэтым годзе на палёх працуе 57 МТС, з іх спэцыяльна ільнаводчых—23. Ільнаводчыя МТС ужо ў гэтым годзе засяваюць 79.400 га тэхкультур. БССР пакрываецца шырокай сеткай заводаў па першапачатковай апрацоўцы ільну і канапель, лік якіх з кожным годам павялічваецца.

Гэтых дасягненьняў мы дабіліся ў выніку няўхільнага правядзеньня генэральнай лініі партыі, у выніку рашучай барацьбы з правымі і «левымі» апартуністамі, у жорсткай непрымірымай барацьбе з клясавым ворагам—кулацтвам.

Цяпер перад намі ва ўсю шырыню стаіць задача дабіцца **павышэньня якасьці** сацыялістычнай гаспадаркі і на аснове арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў—як цэнтральнай важнейшай задачы, праводзіць усю работу па далейшым калгасным будаўніцтве.

Партыя паставіла задачу перад ільнаводчымі калгасамі ўжо ў гэтым годзе дабіцца значнага **павышэньня ўраджайнасьці**. Ня менш 2,6 цэнтн. ільна-валакна—вось той мінімум, за які павінна быць разгорнута барацьба. Аб тым, што гэта задача можа быць выканана, ня прыходзіцца шмат даказваць. Даволі прывесьці факты з работы калгасу **«Барацьбіт»**, Чырвонапольскага раёну, які, дзякуючы ўжываньню ўсіх агра-тэхнічных мерапрыемстваў, атрымаў у мінулым годзе ўраджай ільна-валакна **6 цэнтн.** і **4,5 цэнтн.** ільна-семя. У той самы час калгас **«1 мая»** ігнараваў агра-тэхнічныя мерапрыемствы і на тэй-жа самай глебе атрымаў ураджай: ільна-валакна—1,4 цэнтн. і 2 цэнтн. семя.

Рэалізацыя ўсіх агра-тэхнічных мерапрыемстваў—ключ да вырашэньня задачы павышэньня ўраджайнасьці. Гэта павінны сабе ўявіць усе ільнаводчыя калгасы і арганізацыі. Але адначасова няма патрэбы даказваць, што ўжываньне ўсіх агра-тэхнічных мерапрыемстваў у калгасах і саўгасах немагчыма, калі ў іх ня будзе **правільна арганізавана праца.**

Аднэй з прычын значных страт у радзе раёнаў і калгасаў пры ўборцы ў мінулым годзе, нізкай якасьці сяўбы і марудных тэмпаў пераапрацоўкі ільну была **абязьлічка і ўраўнілаўка, адсутнасьць правільнай арганізацыі працы.**

Правільная расстаноўка сіл набывае выключнае значэньне. Памылкі мінулых гадоў неабходна ўлічыць, каб іх не паўтараць. Асабліва гэта павінны ўлічыць рашаючыя ільнаводчыя раёны, для якіх тэрмін сканчэньня сяўбы тэхкультур—**25** мая. Ільнаводчыя раёны і калгасы павінны таксама мець на ўвазе і тое, што партыяй і ўрадам прынята пастанова аб правядзеньні ў гэтым годзе раньняга пасеву тэхкультур ня менш 75 проц.

Посьпех сяўбы будзе забясьпечан толькі пры тэй умове, калі партарганізацыі ільнаводчых раёнаў па-баявому рэалізуюць пастанову ЦК партыі ад 4 лютага аб арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў і неадкладна ліквідуюць усе памылкі, якія будуць выяўлены ў часе першых дзён сяўбы, калі па палёх будуць працаваць правільна арганізаваныя вытворчыя брыгады на чале з вопытнымі брыгадзірамі.

Першай задачай, якая стаіць перад намі ў галіне арганізацыі працы ў ільнаводчых калгасах—гэта **ЛІКВІДАЦЫЯ АБЯЗЬЛІЧКІ.** У друку была апублікавана пастанова Наркамзему СССР аб тым, што «адказнасьць за якасьць работы па ўжываньні агра зоа-тэхнічных мерапрыемстваў унутры брыгад нясе персанальна брыгадзір». Ці ведаюць аб гэтай пастанове брыгадзіры, калгаснікі і ўсе работнікі калгасна-земельных арганізацый? Трэба сказаць, што ў большасьці выпадкаў гэта пастанова не рэалізуецца, а ў радзе месц нават ігнаруецца. Часта замест назначэньня брыгадзіраў праўленьнямі і падбору іх з лепшых калгаснікаў, дапускаюць шляхам галасаваньня выбары малаасьвядомых і малавопытных калгаснікаў. Адсюль мы маем і цякучасьць сярод кіруючых работнікаў калгасаў. У выніку няма даму адказваць за бязгаспадарчасьць або страты, нанесеныя калгасу. Існуючая да гэтага часу цякучасьць кіруючых работнікаў калгасаў як праўленьняў, так і брыгадзіраў, павінна быць спынена. Апошняя пастанова **ЦК УсеКП(б) ад 10 мая зусім** ясна гаворыць, што **праўленьні** калгасаў **выбіраюцца**, а **брыгадзіры назначаюцца** праўленьнямі калгасаў ня менш, чым на адзін год. Гэта значыць, што трэба пакласьці канец існуючай у радзе месц практыцы сыстематычнай зьмены кіруючых работнікаў калгасаў, якая вядзе ў канчатковым выніку да абязьлічкі і безадказнасьці. Гэта пастанова абавязвае ўсе пазвы арганізацыі сур'ёзна падыходзіць да падбору кіруючых работнікаў калгасаў. Менш адміністраваньня, а больш канкрэтнай і штодзённай дапамогі калгасам у падборы кіруючых работнікаў.

Перанесьці цэнтр цяжару барацьбы за ўраджай, за сваячасовы пасеў, уборку і пераапрацоўку тэхкультур у брыгаду, апэрацыйна кіраваць і дапамагаць у рабоце брыгадзіраў—задача ўсіх калгасных ячэек і праўленняў калгасаў. Толькі пры такой пастаноўцы работы мы сваячасова правядзем сяўбу, уборку, пераапрацоўку і здачу ў тэрмін дзяржаве сырцу.

Даныя ходу сяўбы сьведчаць, што імкнна адсутнасьць такой пастаноўкі работы ў радзе раёнаў зьяўляецца прычынай таго, што паўднёвыя раёны ўжо прапускаюць раньнія тэрміны пасеву ільну. 15 мая гэтыя раёны павінны скончыць сяўбу, а на 10 мая плян пасеву выканан толькі на 3,3 проц. Зацягваюць таксама сяўбу і цэнтральныя раёны, тэрмін сканчэньня па якіх — 20 мая, а плян пасеву выкананы на 3,3 проц. Таксама не здавальняючыя тэмпы сяўбы і па паўночных раёнах, якія выканалі плян на 0,3 проц. У выніку зацяжкі плян сяўбы па рэспубліцы выканан на 1 проц. Ня лепш праводзяць сяўбу і МТС, якія выканалі плян толькі на 1,1 проц.

Да сканчэньня сяўбы тэхкультур засталіся лічаныя дні. Першыя дні сяўбы паказваюць тэндэнцыі да расьцягваньня пасеву тэхкультур у асобных раёнах. Гэта тэндэнцыя павінна **атрымаць рашучы адпор.** Па прыкладзе перадавых калгасаў, якія ў адказ на пастанову ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб збожжазагатоўках і жывёлазагатоўках скарачаюць тэрміны сяўбы, павінны пасьледаваць усе іншыя калгасы і раёны.

Задача ўсіх ільнаводчых раённых арганізацый—паставіць у цэнтр увагі **барацьбу за тэхкультуры.** Шырока растлумачыць калгаснікам дэкрэт аб с.-г. падатку і льготах, якія гэтым дэкрэтам даюцца за пасеў тэхкультур. Дэкрэт аб с.-г. падатку таксама павінен паслужыць магутным стымулам для выкананьня плянаў пасеву тэхкультур па аднаасобным сэктары.

Шляхам шырокага растлумачэньня калгаснікам і працоўным аднаасобнікам апошніх пастаноў партыі і ўраду **аб збожжа і мясазагатоўках,** дэкрэту аб сельгаспадатку, раённыя парт-арганізацыі і низавыя партыйныя ячэйкі павінны павесьці работу за ўкараненьне ўсіх дасягненьняў агра - навукі ў сельскай гаспадарцы, за ўвядзеньне правільнага севазвароту, сваячасовае сканчэньне сяўбы, добраякасную апрацоўку глебы, максымальнае ўжываньне радавога пасеву і г. д., змагацца за падвышэньне ўраджайнасьці ўсіх культур і прадукцыйнасьці жывёлагадоўлі, як неадрыўнай часткі ільнаводчых гаспадарак.

Вырашэньне праблемы тэхкультур вымагае напружанай работы ад усіх арганізацый. Сяўба тэхкультур зьяўляецца першым этапам гэтай барацьбы. Кулацтва будзе імкнуцца затармазіць пасьпяховае правядзеньне пасеўнай і весьці падрыўную работу па скарачэньні пасеўных плошчаў. Гэтыя спробы кулацтва і апартуністаў павінны атрымаць рашучую адпор. **Пляны пасеву тэхкультур могуць і павінны быць выкананы поўнасьцю і ў тэрмін.**

АБВЯШЧАЕМ УСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС НА ЛЕПШАЕ І ХУТЧЭЙШАЕ СКАНЧЭНЬНЕ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

Разгорнем шырокую масавую работу за практычнае ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК і СНК аб збожжа і жывёлазагатоўках, за сваячасовы засеў усяго яравога кліну, укараненьне агра-тэхнікі, добраякасную апрацоўку глебы, узьняцьце ўраджайнасьці

На 15-га мая засеяна толькі 9,1 проц. яравога кліну

Зводка НКЗБ аб ходзе сяўбы яравых культур па раёнах БССР па 15 мая павінна прыказаць увагу ўсіх партарганізацый, усёй пралетарскай і калгаснай грамадзкасьці.

Наступілі рашаючыя дні, ад якіх залежаць посьпехі працай пасеўнай. Масавая сяўба па ўсіх этапах павінна быць у поўным разгары. Аднак, пераважная частка раёнаў яшчэ не ўлічала сапраўды бальшавіцкіх тэмпамі, некаторыя раённыя арганізацыі спазняюць вялізарнага гаспадарча-палітычнага значэньня максымальна ўшчыльнёных тэрмінаў сяўбы.

Калі па **10 мая** па БССР плян быў выкананы на **5,4 проц.**, дык на **15 мая — 9,1 проц.** Прырост усяго толькі на **3,7 проц.** замест **2,8 проц.** у мінулую пяцідзённку. Пры такім марудным узьніманьні крывой тэмп — да 30 мая плян сяўбы яравога кліну па БССР ня будзе выкананы. Кожная партарганізацыя павінна ўлічыць, што засталася толькі тры пяцідзённкі, ад якіх залежыць 100 проц. выкананьне плянаў у вызначаныя партыяй тэрміны.

У сэктарыяльным разрэзе на 15 мая плян сяўбы выканан: **саўгасамі — на 10,1 проц., калгасамі — 8,2 проц., аднаасобнікамі — 10,3 проц., машына-трактарнымі станцыямі—8,6 проц.** Калгасны сэктар значна адстае, адстаюць і МТС. Гэта тлумачыцца не «аб'ектыўнымі» прычынамі, а вытлочна тым, што раённыя арганізацыі слаба змагаюцца за правільную расстаноўку сіл у пасталных вытворчых брыгадах, не ўхапіліся за брыгаду, як асноўнае зьвяно ў арганізацыі калгаснай працы.

Выкананьне плянаў па зонах наступнае: **па паўднёвай — 16,3 проц., цэнтральнай — 8 проц., паўночнай—2,8 проц.** Апошні тэрмін выкананьня пасеўпляну па паўднёвай зоне — 20 мая. Прыведзеныя лічбы выразна сьведчаць аб тым, што большасьць раёнаў паўднёвай зоны ня выканала дырэктыў партыі і ўраду аб ўшчыльнёных тэрмінах сяўбы. Тэрміны сяўбы раньніх яравых ужо прапушчаны.

Па-ранейшаму ў паўднёвай зоне першымі ідзе **Жыткавіцкі** раён, які на 15 мая **выканаў плян сяўбы на 58 проц.** Ганебна адстаюць: **Бабруйскі — 5,1 проц., Рагачоўскі — 6,8 проц., Уваравіцкі — 6,2 проц., Чачэрскі — 7,2 проц.** Іх нават значна абагнялі раёны цэнтральнай зоны: **Чырвона-Слабодзкі — 31 проц., Вузьдзенскі — 26 проц., Капыльскі — 25,9 проц., Клічаўскі —19,4 проц.**

Усебеларускі КОНКУРС, які абвешчан Наркамземам на лепшае і хутчэйшае правядзеньне сяўбы, **павінен паслужыць вялізарным штуршком для выкананьня і перавыкананьня пасеўных плянаў.** Аб конкурсе павінен ведаць кожны рабочы саўгасу, кожны калгаснік, бядняк і серадняк — аднаасобнік.

Для прамяваньня лепшых раёнаў, МТС, саўгасаў, калгасаў, брыгад, брыгадзіраў і ўдарнікаў вылучан прэміяльны фонд у суме 110 тыс. руб., выпачаны прэмтавары, 1.500 ганаровых грамат, месцы на курорты, экскурсіі і інш.

Галавая задача кожнай партарганізацыі — **неадкладна разгарнуць работу па конкурсе, шырока папулярызаваць пастановы ЦК і СНК СССР, новы закон аб сельгаспадатку,** вылавіць лепшых эмагараў на фронце трэцяй пасеўнай і адпаведна іх прамяваць.

Яравы клін БССР у колькасьці 2.689 тыс. га павінен быць засеян у тэрмін—таксама дырэктыва КП(б)Б.

Жыткавіцкі раён—першы кандыдат на прэміяваньне,

ЯКІ ЗАСЕЯЎ 58 проц. ЯРАВОГА КЛІНУ

Зводка НКЗБ аб ходзе сяўбы яравых культур па раёнах БССР на 15 мая 1932 г.

Назва раёнаў	Плян	Засеяна	Проц. выкананьня
ПАЎДНЁВАЯ ЗОНА:			
1. Бабруйскі	56.920	2.898	5,1
2 Брагінскі	20.850	5.027	24,1
3. Буда-кашалёўскі	21.950	2.941	13,4
4. Веткаўскі	40.300	3.894	9,7
5. Гомельскі	25.876	2.122	8,2
6. Гэтскі	38.240	13.554	35,4
7. Ельскі	17.160	3.052	17,8
8. Жлобінскі	42.400	3.990	9,4
9. Жыткавіцкі	9.060	5.254	58,0
10. Камарынскі	12.230	2.108	16,5
11. Карматскі	37.098	4.945	13,3
12. Лельчыцкі	13.450	2.365	25,0
13. Лоеўскі	22.040	8.629	16,5
14. Любанскі	20.970	4.271	20,4
15. Мазырскі	43.760	10.496	24,0
16. Нарадзьлянскі	25.500	2.707	10,6
17. Парыцкі	33.610	12,764	38,9
18. Петрыкаўскі	35.650	6.525	10,3
19. Рагачоўскі	50.590	3.456	6,8
20. Рэчыцкі	40.468	3,981	9,8
21. Старобінскі	22.230	5.226	23,5
22. Тураўскі	8.200	2.585	31,6
23. Уваравіцкі	32.049	1.973	6,2
24. Чачэрскі	25,099	1.869	7,4
25. Церахаўскі	42.580	6.957	16,3
26. Хойніцкі	21.850	4.451	20,4
Разам па паўдн. зоне:	760.120	123.955	16,3
ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗОНА:			
27. Асіпавіцкі	22.400	2,403	10,4
28. Барысаўскі	40.200	3.156	7,9
29. Быхаўскі	55.255	4.253	7,7
30. Бутомльскі	20.200	1.360	6,7
31. Бялыніцкі	35,530	942	2,7
32. Берозінскі	35.950	3.917	10,9
33. Горацкі	55.100	2.638	4,8
34. Заслаўскі	25.500	2.431	9,5
35. Касьцюковіцкі	64.500	4.271	6,6
36. Клімавіцкі	49.700	2.645	5,3
37. Клінаўскі	62.200	6.236	19,4
38. Капыльскі	35.450	9.196	25,9
39. Койданаўскі	47,727	3.130	6,6
40. Крупскі	40.260	3.658	9,1
41. Крычаўскі	21.550	1.576	7,3
42. Лагойскі	28.270	2.668	9,4
43. Магілёўскі	66.970	3.040	4,5
44. Менскі	60.695	3.330	6,6
45. Мсьціслаўскі	49.850	2.952	5,9
46. Плешчаніцкі	23.350	1.562	6,6
47. Прапойскі	31.800	2.042	6,4
48. Пухавіцкі	62.307	2.230	6,2
49. Слуцкі	43.434	4.899	11,3
50. Смалявіцкі	37.400	3.532	9,4
51. Стара-Дарожскі	22.150	1.943	8,8
52. Талочынскі	54.144	419	0,8
53. Вузьдзенскі	21.207	5.506	26,0
54. Чавускі	61.540	3.016	4,9
55. Чырвонапольскі	31.128	2.216	7,1
56. Чырвонаслабодзкі	16.690	5.301	31,8
57. Чэрвеньскі	28.443	3.591	12,6
58. Чэрыкаўскі	30.704	1.725	5,6
59. Шклоўскі	58.936	736	1,4
Разам па цэнтр. зоне:	1.290.676	103.577	8,0
ПАЎНОЧНАЯ ЗОНА:			
60. Аршанскі	69.991	2.035	2,9
61. Асьвейскі	15.437	529	3,4
62. Бешанковіцкі	42.700	524	1,4
63. Віцебскі	39.508	947	2,4
64. Вушацкі	83.450	1.338	4,0
65. Гарадоцкі	60.212	722	1,2
66. Дрысенскі	87.850	718	1,9
67. Дуброўенскі	38.850	1.532	3,9
68. Лёзьнянскі	47.400	1.448	3,1
69. Лепельскі	40.300	1.859	4,6
70. Полацкі	48.776	1.538	3,2
71. Расонскі	24.750	165	0,2
72. Сеньненскі	44.107	2.067	4,7
73. Сіроцінскі	39.800	1.336	3,4
74. Суражскі	29.100	305	1,0
75. Чашніцкі	26.250	895	8,4
Разам па паўночн. зоне:	638.481	18.028	2,8
Разам па БССР:	2.689.277	245.560	9,1

Увага 1. Зводка складзена па 15 мая па 65 раёнах; па трох раёнах уключаны даныя на 10 мая, якія не ўвайшлі ў папярэднюю зводку; па астатніх уключаны папярэднія весткі.

2. Лічбы ходу сяўбы па саўгасах па кожным раёне ўключаны паводле даных саўгаспрэстаў.

Кіраўнік Пасеўбюро НКЗБ
ТАРАСЕВІЧ.

Аб усебеларускім конкурсе на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы раёнамі, сельсаветамі, МТС, саўгасамі, калгасамі і брыгадамі

Пастанова Народнага Камісарыяту Зямляробства БССР

1. Палажэньні і ўмовы конкурсу зацьвердзіць.

2. Для прамяваньня лепшых раёнаў, сельсаветаў, МТС, саўгасаў, калгасаў, брыгад, брыгадзіраў, лепшых ударнікаў рабочых саўгасаў, калгаснікаў, спэцыялістаў сельскай гаспадаркі вылучыць прэміяльны фонд у суме 110.000 руб., 100 ганаровых грамат саўгасам, МТС, калгасам, сельсаветам, 1.500 ганаровых грамат лепшым ударнікам рабочых саўгасаў, МТС, калгаснікам, калгасніцам і спэцыялістам сельскай гаспадаркі. Лепшаму ільнаводчаму калгасу, які абслугоўваецца МТС, устанавіць прэмію — пераходны сьцяг газэты «Зьвязда».

3. Для кіраўніцтва конкурсам стварыць рэспубліканскі штаб у складзе т. т. Рачыцкага, Варабёва, Турэцкага (Наркамзем), Стрэле, Залескага (Калгасцэнтр), Каршакевіча (Трактарацэнтр), Леднікава (ЦК КП(б)Б), Войнава (газ. «Зьвязда») і прадстаўнікоў ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ, газэт «С.-г. рабочы», «Савецкая Беларусь», «Калгаснік Беларусі», «Орка», НК Аховы Здароўя, Белкаапсаюзу, Загатлён, Загатзбожжа і Наркамснабу.

4. У раёнах для правядзеньня конкурсу стварыць пры РВК конкурсныя камісіі з прадстаўнікоў савецкіх устаноў і грамадзкіх арганізацый. Стварыць аналёгічныя конкурсныя камісіі пры сельсаветах.

5. Абавязаць загадчыкаў райза, старшынь райкалгассаюзаў, Трактарацэнтр, Калгасцэнтр, саўгастрэсты, пачынаючы з 22 мая г. г., кожную дэкаду пасылаць у цэнтральны штаб Наркамзему весткі аб ходзе конкурсу і шырока папулярызаваць значэньне і задачы конкурсу на сходах рабочых саўгасаў і калгаснікаў.

6. Абвешчаны Калгасцэнтрам конкурс ад 27 красавіка 1932 году аб правядзеньні веснавой сяўбы ўключаецца ва ўсебеларускі конкурс.

Народны камісар Зямляробства БССР РАЧЫЦКІ.

ПАЛАЖЭНЬНЕ АБ КОНКУРСЕ

на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы раёнамі, сельсаветамі, МТС, саўгасамі, калгасамі і брыгадамі

Бурны рост індустрыялізацыі краіны, задача пасьпяховага выкананьня плянаў чацьвёртага, заключнага году першай пяцігодкі і пераход да другой пяцігодкі патрабуюць ад с.-г. вытворчасьці напружаных тэмпаў работы, асабліва ў адзін з адказнейшых перыядаў работы — у перыяд правядзеньня веснавой сяўбы.

Трэцяя бальшавіцкая сяўба праходзіць пад знакам барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за агратэхніку, за высокую якасьць работы, што павінна забясьпечыць павышэньне ўраджайнасьці саўгасна-калгасных палёў, павышэньне таварнасьці сельскай гаспадаркі.

Толькі пры ўмове актыўнага ўдзелу ў сяўбе кожнага саўгасу, МТС, калгасу, брыгады, брыгадзіра, рабочага, калгасніка і спэцыяліста сельскай гаспадаркі могуць быць выкананы як колькасныя, так і якасныя паказальнікі плянаў веснавой сяўбы ў максымальна скарочаныя тэрміны.

У мэтах садзейнасьці шырокаму разгортаньню актыўнасьці рабочых саўгасаў, МТС, калгаснікаў, калгасніц і спэцыялістаў сельскай гаспадаркі ў справе барацьбы за бальшавіцкія тэмпы ў правядзеньні веснавой сяўбы—Народны Камісарыят Зямляробства БССР абвяшчае ўсебеларускі конкурс на лепшае правядзеньне веснавой посеўнай кампаніі 1932 году.

У конкурсе прымаюць удзел раёны, сельсаветы, МТС, саўгасы, калгасы і брыгады.

УМОВЫ КОНКУРСУ

1. Лепшая распрацоўка ў брыгадах і хутчэйшае правядзеньне да кожнага калгасніка і рабочага саўгасу пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб збожжа і мясазагатоўках, разгортваньні калгаснага пандлю, новага закону аб с.-г. падатку і практычнае іх ажыцьцяўленьне ў часе сяўбы.

2. Выкананьне плянаў сяўбы ў вызначэньня Наркамземам (гл. «Зьвязду» ад 6 красавіка) тэрміны, палепшыўшы якасьць апрацоўкі глебы, поўнасьцю ўжываючы агратэхнічныя мерапрыемствы.

3. Правільная арганізацыя пастаянных вытворчых брыгад у калгасах і лепшае выкананьне імі вытворчых заданьняў па сяўбе.

4. Поўны пераход рабочых саўгасаў на прынцып гаспадарчага разрахунку і ўвядзеньне выдзельшчыны ва ўсіх калгасных брыгадах.

5. Поўная ліквідацыя абязьлічкі трактараў, жывой цягавай сілы і с.-г. інвэнтару. Максымальна поўнае іх выкарыстаньне. Забясьпечанасьць коняй фуражом, ліквідацыя абязьлічкі ў догляде іх. Эканомія гаручага і змазачнага.

6. Арганізацыя перадачы вопыту работ лепшых брыгад, рабочых і калгаснікаў у практыку ўсіх калгасаў і саўгасаў.

7. Арганізацыя вытворчых нарад у саўгасах, калгасах, брыгадах і актыўная іх работа.

8. Ахоп усіх рабочых саўгасаў, калгаснікаў і брыгад сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам.

9. Арганізацыя рэгулярнага выпуску насьценгазэт, шматтыражак і арганізацыя працы з рабкорамі.

10. Увядзеньне шматпольных севазвароту, якія адпавядаюць спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі.

11. Стопроцантнае выкананьне плянаў пратручваньня, ачысткі і праверкі якасьці насеньня; абмен звычайнага насеньня на гатункавае; пасеў гатункавым і палепшаным насеньнем; поўнае выкарыстаньне саўгасамі і калгасамі радавых сэлярак ў часе веснавой сяўбы.

12. Выкананьне плянаў па вывазцы саўгасамі і калгасамі мінэральнага ўгнаеньня, поўнага і правільнага яго выкарыстаньня. Выкананьне плянаў вапнаваньня, торфаваньня, збору і правільнага выкарыстаньня попелу. Сваячасовая вывазка і правільнае выкарыстаньне саўгасамі і калгасамі гною.

13. Выкананьне заданьняў па сяўбе, пашырэньне пасеўных плошчаў у саўгасах і калгасах за лік асваеньня новых зямель (раскарчоўка, узорваньне цаліны і г. д.).

14. Належная пастаноўка ўліку ў калгасах, забясьпячэньне калгаснікаў працоўнымі кніжкамі, арганізацыя правільнага і сваячасовага запісу працадзён у працоўныя кніжкі не радзей аднаго разу ў пяцідзённку. Дакладны ўлік калгаснікаў-ударнікаў, правядзеньне з імі выхтэчу.

ПРЭМІЯВАНЬНЕ

Для прэміяваньня лепшых раёнаў, сельсаветаў, МТС, саўгасаў, калгасаў, брыгад, брыгадзіраў, рабочых, калгаснікаў, калгасніц і спэцыялістаў сельскай гаспадаркі, якія лепш і раней за ўсіх правядуць веснавую сяўбу, выканаюць умовы конкурсу,—устанавіць наступныя прэміі:

1. Для лепшага ільнаводчага калгасу, які абслугоўваецца МТС—пераходны сьцяг газэты «Зьвязда»;

2. Адна прэмія для лепшага раёну—20.000 руб.

3. Тры прэміі для лепшых сельсаветаў па 2.000 руб.

4. Тры прэміі МТС па 3.000 руб.

Пяць прэмій саўгасам па 750 руб.

6. 15 прэмій калгасам па 1.000 руб.

7. Пяць прэмій лепшым брыгадзірам (пасылка на курорт) па 400 руб.

8. 10 прэмій лепшым брыгадзірам (скураной вопраткай) па 200 руб.

9. 50 прэмій брыгадзірам (рознымі рэчамі) па 100 руб.

10. 50 прэмій калгаснікам-ударнікам грашыма па 100 руб.

11. 50 прэмій лепшым калгаснікам-ударнікам (экскурсіі) па 100 руб.

12. 15 прэмій старшыням калгасаў па 200 руб.

13. 5 прэмій дырэктарам саўгасаў па 400 руб.

14. 50 прэмій лепшым рабочым саўгасаў і МТС (рознымі рэчамі) па 150 руб.

15. 5 прэмій старшыням сельсаветаў па 300 руб.

16. 5 прэмій насьценгазэтам па 150 руб.

17. 5 прэмій шматтыражкам па 100 р.

18. 2 прэміі дырэктарам МТС па 400 руб.

19. 5 прэмій старшыням райкалгассаюзаў па 400 руб.

20. 5 прэмій загадчыкам райза па 500 руб.

21. 10 прэмій агрэномам па 500 руб.

22. Адна прэмія станцыі па барацьбе са шкоднікамі расьлін—1.000 руб.

23. Дзьве прэміі праверачным пунктам па якасьці насеньня па 500 руб.

24. Дзьве прэміі лепшым камандам, пасланым у дапамогу па веснавой сяўбе ЦК ЛКСМБ і ВСФК—па 500 руб.

25. 5 прэмій раённым газэтам па 1.000 руб.

Устанавіць 100 ганаровых грамат саўгасам, МТС, сельсаветам і калгасам. Устанавіць 1500 ганаровых грамат рабочым-ударнікам саўгасаў, МТС, калгаснікам і с.-г. спэцыялістам.

СТАЛІНСКІ ПАХОД ЗА ПАЛЯПШЭНЬНЕ РАБОЧАГА СНАБЖЭНЬНЯ

Новая абстаноўка, новыя задачы патрабавалі па-новаму ажыцьцяўляць кіраўніцтва ўсімі вучасткамі гіганцкай будоўлі.

Сутнасьць, асаблівасьці гэтых новых задач, канкрэтныя шляхі перабудовы з вычарпальнай паўнатой і яснасьцю сфармуляваны ў 6 гістарычных умовах тав. СТАЛІНА.

Тыя прадпрыемствы, тыя фабрыкі і заводы, дзе 6 сталінскіх умоў на справе ператвараюцца ў жыцьцё — скапдаюць калёну перадавікоў, пасьпяхова выконваюць вытворчыя праграмы, паказваюць узоры бальшавіцкіх тэмпаў работы.

Дабіваюцца новых посьпехаў, гэта значыць поўнасьцю ажыцьцяўляць усе 6 арганічна паміж сабой зьвязаных сталінскіх умоў. Неразуменьне гэтай арганічнай сувязі, недаацэнка аднэй з умоў на практыцы вядзе да зьмяншэньня вытворчага эфэкту, тармозіць пасьпяховы рух наперад.

Такое неразуменьне, недаацэнка праяўляецца асобнымі работнікамі і ў адносінах да важнейшай сталінскай умовы — ПАЛЯПШЭНЬНЯ МАТАРЫЯЛЬНА-БЫТАВОГА АБСЛУГОЎВАНЬНЯ РАБОЧЫХ, ПАЛЯПШЭНЬНЯ СНАБЖЭНЬНЯ.

Ня ўсюды і ня ўсе яшчэ работнікі і, у прыватнасьці, прафсаюзныя ўразумелі, як сьлед, ШТО ПЫТАНЬНЕ РАБОЧАГА СНАБЖЭНЬНЯ, ШТОДЗЕННЫЯ КЛОПАТЫ АБ МАЛЫХ І ВЯЛІКІХ ПАТРЭБАХ РАБОЧЫХ — ГЭТА АДНО З ТЫХ ЗЬВЕНЬНЯЎ РАБОТЫ, БЕЗ ЯКІХ НЯМЫСЬЛІМЫ ПАСЬПЯХОВЫ РУХ НАПЕРАД.

І зараз яшчэ некаторыя партыйныя ячэйкі на прадпрыемствах пытаньне рабочага снабжэньня разглядаюць ня ў цеснай сувязі з вытворчымі задачамі, не займаюцца штодзённа, канкрэтна вывучэньнем і работай па задавальненьні патрэб рабочага быту.

Партыя паставіла пытаньне рабочага снабжэньня ў разрад ПЕРШАЧАРГОВЫХ побач з пытаньнямі індустрыялізацыі. Створаны ўсе магчымасьці для разьвіцьця савецкага гандлю, разгортваньня самазагатовак, таваразвароту, калгаснага гандлю і на аснове гэтага для няўхільнага паляпшэньня рабочага снабжэньня.

Разгортваючы гэту работу, каапэрацыйныя арганізацыі павялічылі свой таваразварот, праводзяць самазагатоўкі, шчыльней зьвязваюцца з прадпрыемствамі. Некаторыя ЗРК дабіліся даволі вялікіх вынікаў у паляпшэньні рабочага снабжэньня. Але дасягнутае яшчэ далёка ад таго, што трэба зрабіць.

АПОШНІЯ ПАСТАНОВЫ ЦК УсеКП(б) І СНК АБ ЗБОЖЖА І ЖЫВЁЛАЗАГАТОЎКАХ, АБ ТРУСАГАДОЎЛІ, ДЭКРЭТ АБ С.-Г. ПАДАТКУ АДКРЫВАЮЦЬ НОВЫЯ МАГЧЫМАСЬЦІ, ВЫСОЎВАЮЦЬ НОВЫЯ ЗАДАЧЫ Ў МАБІЛІЗАЦЫІ ДАДАТКОВЫХ ХАРЧОВЫХ РЭСУРСАЎ ДЛЯ РАБОЧАГА СНАБЖЭНЬНЯ.

Навучыцца хутка і поўнасьцю выкарыстоўваць гэтыя магчымасьці (праз калгасны гандаль, самазагатоўкі, сьвінаадкорм, трусагадоўлю і інш), разьвіць у гэтым напрамку ініцыятыву каапэрацыйна-гандлёвых і прафсаюзных арганізацый, усямерна павялічваць і паскараць таваразварот, пашыраць гандлёвую сетку, палепшаць ня работу — у гэтым заключаецца сапраўдная барацьба за рэалізацыю другой сталінскай умовы.

**І таму НАДЗВЫЧАЙ КАШТО

Партыйнае будаўніцтва

ВЫКРЫВАНЬНЕ БУРЖУАЗНАЙ СУТНАСЬЦІ УСЯКІХ ПРАЯУЛЕНЬНЯУ ШАВІНІЗМУ—

АДНА З ВАЖНЕЙШЫХ УМОУ ПАСЬПЯХОВАГА АЖЫЦЬЦЯУЛЕНЬНЯ ЛЕНІНСКАЙ НАЦПАЛІТЫКІ

Больш клясавай пільнасьці

Барацьба за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі зьяўляецца сустаўной часткай агульных задач сацыялістычнага будаўніцтва. Выразна і пасьлядоўна праводзячы ленінскую лінію партыі ў нацыянальным пытаньні, КП(б)Б на чале з сваім ЦК забясьпечыла вялізарнейшыя посьпехі ў справе пабудовы нацыянальнай па форме, пралетарскай па зьмесьце культуры.

Дзесяткі вышэйшых і сотні сярэдніх навучальных устаноў, ахоп рознымі зьвеньнямі першапачатковай школы 97 проц. дзяцей школьнага ўзросту, завяршэньне ў асноўным ліквідацыі няпісьменнасьці, карэнізацыя апарату за лік лепшых пралетарскіх кадраў з нацыянальнасьцяй, якія насяляюць БССР, шырокае абслугоўваньне працоўных культурна-асьветнымі ўстановамі, актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве працоўных усіх нацыянальных меншасьцяй, з абслугоўваньнем іх на роднай мове— такі ў асноўных рысах рэзультат бальшавіцкага змаганьня за ажыцьцяўленьне нацпалітыкі.

Павышэньне тэмпаў разьвіцьця прамысловасьці БССР, посьпехі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і нацыянальна-культурнага будаўніцтва дасягнуты ў бязьлітасным барацьбе з клясавым ворагам і яго агентурай—правымі і «левымі» апартуністамі, прыміренцамі і ўхілістамі ў нацыянальным пытаньні. Выразна ажыцьцяўляючы ленінскую нацы[illegible] КП(б)Б рашу[illegible]альную палітыку [illegible] ча змагаецца з праяўленьнямі ўхілу да вялікa-дзяржаўнага шавінізму, выкрываючы яго рэакцыйнасьць і сацыяльныя карэньні. Разьбіт і шырока вы крыт перад працоўнымі масамі беларускі контр-рэвалюцыйны нацыянал-дэмакратызм, як агентура польскага фашызму. Нанесен руйнуючы ўдар па ўхілу ў бок беларускага шавінізму.

Але нельга ні на хвіліну ўпушчаць з пад увагі таго, што аджываючыя клясава-варожыя элемэнты ўнутры краіны вядуць далей у розных формах сваё супраціўленьне сацыялістычнаму наступленьню. **Прымежнае становішча БССР з капіталістычным сьветам, з фашысцкай Польшчай асабліва патрабуе ад нас найвялікшай пільнасьці на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.**

Сакавіцкі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б у сваёй пастанове аб далейшых задачах культурнага будаўніцтва высунуў перад усёй партарганізацыяй першачарговай задачай — **павышэньне і ўзмацненьне пільнасьці і непрымірымай барацьбы** да праяўленьняў ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму—галоўнай небясьпекі на даным этапе, да праяўленьняў ухілу да беларускага шавінізму, яўрэйскага, польскага і інш. відаў шавінізму, а так сама прымірэнцтва да ўсякіх спроб скажаць ленінскую нацыянальную палітыку. Бяз гэтай барацьбы нямысьлімa пасьпяховае ажыцьцяўленьне вызначанай пленумам разгорнутай праграмы дзеяньняў на фронце культурнага будаўніцтва, якое мае вялізарнейшае значэньне ў сыстэме агульнай барацьбы за вырашэньне сусьветг[illegible]стяць русл[illegible] кіруецца [illegible] супроць ухілаў у нацыянальным пытаньні.

Да сьледства на справе Гарулава

гістарычных задач другой пяцігодкі.

У сыстэме ўсёй работы па ажыцьцяўленьні задач ленінскай нацыянальнай палітыкі неабходна мясцовым партарганізацыям зьвярнуць у большай меры ўвагу на правядзеньне беларусізацыі, карэнізацыю апарату і інтэрнацыяналізацыю прадпрыемстваў.

Матар'ялы з месц, якія сёньня друкуюцца ў нашай газэце, характарызуюць сабой недаацэнку з боку асобных партарганізацый навучальных устаноў (Менскі сельска-гаспадарчы архітэктурны і будаўнічы тэхнікум) задач правядзеньня беларусізацыі. Гэта недаацэнка, пагардлівыя адносіны да беларускай мовы, ігнараваньне дырэктыў партыі ў гэтым пытаньні ёсьць ня што іншае, як адзін з відаў, у нашых умовах, праяўленьня вялікадзяржаўнага шавінізму.

Вылазка ў Гомельскім рабфаку тэхніка-машына-будаўнічага інстытуту студэнтаў Цішкевіча, Курыліна і інш. зьяўляецца адной з праяў дзейнасьці рэштак разгромленай беларускай контр-рэвалюцыйнай нацдэмаўшчыны.

Усё гэта патрабуе ад кожнай мясцовай партарганізацыі большай выразнасьці ў рабоце на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва, павышэньня клясавай пільнасьці, узмоцненай работы па інтэрнацыянальным выхаваньні працоўных мас і мабілізацыі іх на бязьлітасную барацьбу супроць усякіх праяўленьняў шавінізму, [illegible] кіруецца [illegible] шавіністычнаму ўхілу.

Ст. Губзр.

Будрык „дзейнічае"

Рэарганізацыя Койданаўскага раёну ў нацыянальны польскі раён — ёсьць адно з мерапрыемстваў ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, якое стварае ўмовы для яшчэ большага эканамічнага і культурнага разьвіцьця раёну, забясьпечвае палепшэньне культурна-бытавога абслугоўваньня працоўных Койданаўшчыны.

Даведаўшыся, што згодна пастановы ЦВК БССР ад **Старасельскага** сельсавету (Заслаўскі раён) да Койданаўшчыны адыходзяць польскія вёскі Перхурава, Сьцяпанава і інш., старшыня гэтага сельсавету Будрык распарадзіўся па-свойму. «Распарадчасьць» яго па сутнасьці носіць яўна шавіністычны характар.

У нацыянальным калгасе «Чырвоны пагранічнік», які адышоў да Койданаўскага раёну, быў добра абсталяваны клюб. Ня дрэнна была наладжана культурна-масавая работа ў гэтым клюбе. Ён заўсёды быў перапоўнен калгасьнікамі і аднаасобнікамі. Лікпункт пры клюбе прэміяваны за добрую работу.

І вось Будрык пачаў разбурыць і перавезьці ў цэнтр сельсавету гэты клюб. Толькі пасьля таго, як дом быў разбураны, агледзеўся старшыня сельсавету, што перавозка і складаньне гэтага будынку абыйдзецца даражэй, чым ён каштуе. Тады ён спыніў сваё «мерапрыемства». Цяпер дом раскіпут і гніе.

Старасельская партыйная ячэйка прымірэнча аднеслася да гэтага абураючага ўчынку. Неабходна Заслаўскаму райкому партыі зацікавіцца гэтай справай, рашуча паставіўшы пытаньне аб паводзінах Будрыка, як камуніста, і даць належную ацэнку [illegible] кіраўніцтвам Ленін[illegible] шавіністычнаму ўчынку.

Ст. Губзр.

Беларуская мова ігнаруецца

Партыйны калектыў Менскага сельска-гаспадарчага архітэктурна-будаўнічага тэхнікуму вельмі мала аддае ўвагі пытаньню беларусізацыі.

Праверка беларусізацыі была праведзена фармальна. Праверачная камісія ня вынесла ніякіх практычных мерапрыемстваў у далейшай рабоце.

Зараз, як і раней, палова выкладчыкаў тэхнікуму праводзіць заняткі са студэнтамі на расійскай мове. Па іх прыкладу большасьць студэнтаў таксама гаворыць і піша па-расійску.

Групавыя насьценгазэты сыгналізуюць аб гэтым і аб бязьдзейнасьці кіруючых арганізацый установы, але звычайна на такія артыкулы ніхто не рэагуе, а рэдкалегіі, зьмясьціўшы артыкулы, супакойваюцца, не дабіваюцца ажыцьцяўленьня іх прапаноў.

Задача партыйнага калектыву—мабілізаваць усю грамадзкасьць установы па зьнішчэньне гэтага вялікага прарыву ў рабоце тэхнікуму.

Ал. Баравы.

НАЦЫЯНАЛ-АПАРТУНІСТЫ АТРЫМАЛІ РАШУЧЫ АДПОР

Гомельская партыйная арганізацыя, змагаючыся за практычнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі, дасягнула значных посьпехаў на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Прасунута наперад справа беларусізацыі савецкага апарату. У большай меры аддаецца ўвага мясцовых партарганізацый інтэрнацыянальнаму выхаваньню мас. Узьнята па вышэйшую ступень клясавая пільнасьць да праяўленьняў шавінізму і ўхілаў у нацыянальным пытаньні.

Аднак, яшчэ ёсьць факты апартуністычнай недаацэнкі беларусізацыі з боку паасобных арганізацый. У апараце 5 эксплёатацыйнага раёну Заходніх чыгунак, у дасьледчым інстытуце. і інш. установах беларусізацыя праводзіцца фармальна. У большасьці выпадкаў пішуцца толькі па беларускай мове справаздачныя матар'ялы. Ужываньне-ж яе ў штодзённай практычнай рабоце — рэдкае зьявішча ў гэтых установах.

За недаацэнкай задач штодзённай практычнай работы па правядзеньні нацыянальнай палітыкі ў паасобных установах, за невыстарчальнай завостранасьцю барацьбы з ухіламі ў нацыянальным пытаньні часамі сьледуюць махровыя шавіністычныя вылазкі супроць лініі партыі. На рабфаку механіка-машына-будаўнічага інстытуту ў часе абмеркаваньня пытаньня аб праве нацый на самазьначэньне, студэнты 3-га курсу **Цішкевіч і Курылін,** маскуючыся палітычнай несьвядомасьцю, выступілі супроць нацыянальнай палітыкі партыі, адлюстроўваючы ў розных формах ідэалёгію беларускай контр-рэвалюцыйнай нацдэмаўшчыны. Цішкевіч у якасьці аргумэнтацыі доказу сваіх поглядаў дайшоў да таго, што нават выказаў спачуваньне разгромленай, у свой час органамі пралетарскай дыктатуры, контр-рэвалюцыйнай арганізацыі СВУ.

Погляды, выказаныя Цішкевічам, падтрымліваў яго аднадумца Курылін, з дадаткам асабістага нездавальня тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва, якія праводзяцца ў БССР. Выступленьне студэнта **Ліўшыца** па сутнасьці таксама адлюстроўвала кулацкую ідэалёгію.

Зусім зразумела, што гэтыя людзі ператварыліся ў ручар клясавага ворага, выступіўшы супроць асноў ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Гомельскі гарком адапіў вылазку Цішкевіча, Курыліна і Ліўшыца, як адыход ад лініі нашай партыі ў нацыянальным пытаньні, як праяўленьне нацыянал-дэмакратызму. Па станові Гаркому Цішкевіч і Курылін выключаны з партыі. У адносінах Ліўшыца, які шчыра прызнаў антыпартыйнасьць сваіх памылак, гарком знайшоў магчымым зацьвердзіць пастанову партыйнага сходу і рабфаку аб вынясеньні яму вымовы.

Гарком сваёй пастановай мабілізуе ўсю гарадзкую партарганізацыю на павышэньне клясавай пільнасьці ў барацьбе за лінію партыі, за ленінскую нацыянальную палітыку.

М. Гафт.

За 1,5 млн. тон добраякаснага торфу

БУЙНЕЙШЫ ТОРФАЗАВОД „БАЛЬШАВІК" СЛАБА ПАДРЫХТАВАЎСЯ ДА СЭЗОНУ

ЗАМЕСТ 16-ці МАШЫН ПРАЦУЕ ТОЛЬКІ 3

Аперацыйная зводка здабычы торфу за 13 мая па заводах Белторфу

НАЗВА ЗАВОДУ	Дзенны плян	Здабыта	Процант выканаўня
Імя Даўмана	234	106,6	45,6
„Закрашынскі мох"	183	71,4	33,4
„Свабода"	266	89,4	33,6
„Шлях сацыялізму"	681	220,4	28,0
„Смалявічы"	202,1	34,4	17,0
„Чырвоная Беларусь"	249	32,9	13,2
„Бальшавік"	1017	96,6	9,5
Асінторф	1159,6	—	—
„Чырвоны сьцяг"	287,2	—	—
Імя 1 мая	202,1	—	—
РАЗАМ	4.650	651,7	14,0

УВАГА: Заводы Асінторф, „Чырвоны сьцяг" і імя 1 мая вестак не даці.

Лёкамабілі валяюцца на станцыі чыгункі

Торфзавод «Бальшавік», Уваравіцкага раёну, невыстарчальна падрыхтаваўся да торфсэзону, аб чым сьведчыць работа першых дзён. З патрэбных 16 торфмашын устаноўлена толькі 6, а з іх увайшлі ў эксплёатацыю 4. Пяць машын дагэтуль не забраны са станцыі Касьцюкоўка. Рабочай сілай торфзавод забясьпечан толькі на 50 проц.

Не пабудаваны для новапрыбываючых рабочых інтэрнаты, што стварае патрозу цякучасьці. Будаўніцтва бараках зацягваецца, ня гледзячы на тое, што матар'ял ёсьць: на станцыі Касьцюкоўка ляжаць прысланыя 5 стандартных дамоў, 50 вагонаў будматар'ялу, гонт і інш. Адміністрацыя тлумачыць гэта «аб'ектыўнымі» прычынамі — адсутнасьцю транспорту [illegible] гасы [illegible] Гомельскі Саюзтранс павінен зараз-жа дапамагчы заводу «Бальшавік» вылучэньнем некалькіх грузавікоў для перавозкі са станцыі Касьцюкоўка машын, лёкамабіляў і інш. Рэчыцкаму цьвіковаму заводу «Інтэрнацыянал» трэба выканаць нарад на дастаўку заводу цьвікоў, што паскорыць будаўніцтва.

На заводзе ёсьць залежы ў 15.000 тон торфу, якія ня вывезены з мінулага году, і гэта тармозіць работу, бо палі для сьцілкі новай здабычы заняты. Гэтыя 15.000 тон трэба было адгрузіць БелДРЭС і Шклобуду, але вывазка затармозілася з тэй прычыны, што дагэтуль ня скончана пабудова вузкакалейкі.

Снабжэньне рабочых торфзаводу зьяўляецца самым адсталым вучасткам работ. Загадчык гандлёвага аддзелу **Мармэлюк** злачынна разбазарвае прадукты, прысланыя для рабочых. Старшыня торфрабкопу **Дзегцяроў** патурае яму ў гэтым.

Такія агідныя факты зьявіліся вынікам адсутнасьці цьвёрдага адзінаначальля, слабага разгортваньня партыйнай і культмасавай работы. Малую ўвагу торфзаводу аддавалі раённыя кіруючыя арганізацыі.

Н. Г.

Торфаздабыча пад пагрозай

Асноўным пастаўшчыком торфаапалу для Барысаўскай ЦЭЦ зьяўляецца торфзавод «Камунар». У мінулым годзе, з прычыны недавыканаўня пляну торфаздабычы, работа ЦЭЦ праходзіла з вялікімі перабоямі. Сёлета завод таксама дрэнна падрыхтаваўся да сэзону. У выніку — торфаздабыча дагэтуль яшчэ не распачалася.

Дырэктар заводу ўвесь час інфармаваў РВК і РК КП(б)Б, што торфа-машыны даўно адрамонтаваны, фактычна-ж на сёньняшні дзень ні адна машына яшчэ ня пушчана ў эксплёатацыю.

Балотная плошча таксама поўнасьцю не падрыхтавана. Каля 40 га зусім не раскарчавана. Не зьнят поўнасьцю і верхні ачос пад фрэзэрны торф.

Не хапае і рабочай сілы. З патрэбных заводу 500 рабочых завербавана толькі 150, на работу-ж дагэтуль ні адзін чалавек не зьявіўся. Не падрыхтаваны, як сьлед, і жыльлёвыя ўмовы для рабочых. Пасьцельных прылад ёсьць толькі на 150 чалавек.

Яшчэ горш справа з забесьпячэньнем рабочых спэцвопраткай. З патрэбных 450 пар бахіл (брэзэнтавы абутак) не дастаўлена яшчэ ні адна пара. Завод знаходзіцца ў веданьні Белзапалкавага аб'яднаньня, якое павінна снабжаць яго спэцвопраткай і іншымі прыладамі. Аднак, кіраўніцтва аб'яднаньня ніякіх мер у гэтым напрамку ня ўжывае.

Вялікай перашкодай разгортваньню торфасэзону зьяўляецца адсутнасьць на заводзе трансфарматара. Па загаду Белторфу ў мінулым годзе заводзкі трансфарматар быў перадан у часовае карыстаньне Асінторфу. Зараз ён там зусім не выкарыстоўваецца. Ня гледзячы на катэгарычныя патрабаваньні заводу, кіраўніцтва Асінторфу дагэтуль трансфарматар не зьвярнула. Белторф (паколькі завод «Камунар» [illegible] да спажыўцоў) таксама не зацікаўлен у звароце трансфарматару.

Такім чынам, выкананьне пляну торфаздабычы на «Камунары» пастаўлена пад пагрозу.

Н.

Неадкладна прыступіць да разгортваньня конкурсу на хутчэйшае і лепшае правядзеньне сяўбы па раёнах

Усім агітмасавым аддзелам ГК і РК КП(б)Б

У мэтах мабілізацыі шырокіх мас рабочых саўгасаў, МТС, калгасьнікаў, бедняко ў і сераднякоў—аднаасобнікаў, каў вакол задач трэцяй веснавой пасеўкампаніі і ўзьняцьця ўраджайнасьці—Наркамзем БССР абвясьціў конкурс па хутчэйшае і лепшае правядзеньне сяўбы раёнам, саўгасам, МТС, калгасам, сельсаветам і вытворчай брыгадай. Надаючы гэтаму конкурсу вялікае гаспадарча-палітычнае значэньне, агітмасавы аддзел ЦК КП(б)Б прапануе:

1. Неадкладна прыступіць да разгортваньня конкурсу па раёне. Для апэрацыйнага кіраўніцтва конкурсам стварыць конкурсную камісію з прадстаўнікаў савецка-гаспадарчых устаноў і грамадзкіх арганізацый раёну. Пры сельсаветах стварыць апалёгічныя конкурсныя камісіі. Распачаць зараз-жа выяўленьне для прэміяваньня лепшых пераможцаў трэцяй бальшавіцкай вясны—саўгасаў, МТС, калгасаў, брыгад, брыгадзіраў і лепшых ударнікаў, выканаўшых умовы конкурсу.

2. Разгарнуць агітмасавую работу сярод рабочых саўгасаў, МТС, калгасьнікоў, бедняко ў і сераднякоў—аднаасобнікаў па растлумачэньні задач і ўмоў конкурсу, мабілізуючы ўвагу шырокіх колаў працоўных па неадкладнае выкананьне задач па хутчэйшым і лепшым скончэньні веснавой сяўбы, правядзеньні мерапрыемстваў па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, падняцьці ўраджайнасьці, ужываньні аграмерапрыемстваў.

3. Пры папулярызацыі конкурсу зьвярнуць асаблівую ўвагу на правільную арганізацыю пастаянных вытворчых брыгад, укараненьне зьдзельшчыны, наладжаньне ўліку працадзён, разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж саўгасамі, МТС, калгасамі, брыгадамі, рабочымі і калгасьнікамі. Выкананьне пляну саўгасамі і МТС павінна праходзіць пры поўным ажыцьцяўленьні 6 умоў тав. Сталіна.

4. Папулярызацыю конкурсу ўвязаць з растлумачэньнем апошніх пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб пляне збожжазагатовак, жывёлазагатовак, дэкрэту ўраду СССР аб с.-г. падатку і з разгортваньнем месячніка рэйду на праверцы рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна.

5. Разгортваньне і ход конкурсу асьвятляць у нізавым, раённым і цэнтральным друку.

Намесьнік загадчыка Агітмасавага аддзелу ЦК КП(б)Б — СЬВЯРДЛОВА.

Х. Дунец

Аб майстрох пагромных спраў

Польскія фашысты перанялі ўсе «лепшыя традыцыі» царскага рэжыму ў адносінах да прыгнечаных народаў і нацменшасьцяй. За апошнія дні тэлеграф прынёс весткі аб разгроме рэштак беларускіх культурных устаноў у Заходняй Беларусі. У даным артыкуле мы ставім мэтай паказаць, як польскія фашысты працягваюць традыцыі царскай Расіі ў галіне яўрэйскіх пагромаў, якія (пагромы) сталі штодзённым зьявішчам у фашысцкай Польшчы, пунктам праграмы фашысцкіх партый.

Будзем гаварыць аб фактах. Калі па ўсёй Польшчы пракацілася хваля яўрэйскіх пагромаў, — гэта мела месца пядаўна, у канцы 1931 г. — яна не прайшла і міма яўрэйскага насельніцтва г. Вільно. Віленскія эндэкі, заводле іх уласных заяў, перапоўненыя чачуцьцём павагі да сваіх яўрэйскіх ратоў па клясе, асабліва да яўрэйскай клерыкальнай чорнай сотні. У гэтым ожна ім паверыць. Але, ня гледзячы па гэта, або імкнна таму, віленскія эндэкі аказаліся, як гэтага і трэба было чакаць, высокімі майстрамі пагромных спраў над бяспраўным яўрэйскім працоўным насельніцтвам. Трэба аддаць справядлівасьць віленскім эндэкам: ва ўтончаным палітычным абрамленьні сваіх пагромных спраў яны аказаліся куды больш кваліфікаванымі за сваіх субратоў Кракава, Варшавы, Лодзі і іншых цэнтраў фашысцкай Польшчы.

Зьвернемся да фактаў. У лістападзе 1931 г. віленскія эндэцкія студэнты ля сьцен унівэрсытэту арганізавалі пагром яўрэйскай студэнцкай моладзі, паставіўшы сабе мэтай ня пусьціць яўрэяў ва ўнівэрсытэт. У часе гэтага зьбіваньня яўрэйскіх студэнтаў, ахвярай з боку польскіх эндэцкіх студэнтаў паў нейкі Вацлаўскі, атрымаўшы сурёзнае раненьне камянем. Дакладна высьвятліць з чыйго боку паў камень у галаву Вацлаўскага не ўдалося. Аднак, пры далейшым разгортваньні падзей, аб'ект для правасудзьдзя на справе пагромленых яўрэйскіх студэнтаў быў знойдзен: быў арыштован... яўрэй Вульпін і інш., якіх абвінавацілі ў нападзе на Вацлаўскага... Такім чынам пагромшчыкі паварнулі ўсю справу ў адваротны бок, замест эндэцкіх грамілі прыгнечаных да судовай адказнасьці студэнтаў-яўрэяў з тым, каб даказаць грамадзкай думцы, што пагромныя дзеньні зрабілі... пагромленыя. Атрымалася не асабліва хітра, але затое ў духу езуіцкай палітыкі.

Гэтымі днямі ў Вільні адбываўся працэс пад Вульпіным і іншымі абвінавачанымі па вышэйназванай пагромнай справе. Як і трэба было чакаць, суд разгледзіў гэту справу не ў разрэзе разгляду меўшых месца антыяўрэйскіх эксцэсаў, а ў разрэзе нападу «асоб яўрэйскай нацыянальнасьці» на студэнтаў пеўрэяў. Абвінаваўчы акт і матывіроўка прыгавору гавораць аб «вулічных эксцэсах... калі яўрэйскія групы пачалі нападаць на асобных акадэмікаў палякаў і рабіць пад імі гвалты». Судовы прыгавор даволі «глыбока» займаецца філёзафаваньнем аб карэньнях нацыянальнай варожасьці. Усё гэта для таго, каб даказаць, што арганізатарамі пагромаў зьяўляюцца не фашысцкія партыі, не фашысцкая частка студэнцтва, якія гэта ажыцьцяўляюць пры дапамозе паліцыі і дзяржаўнага суда, а беззбаронныя яўрэйскія масы. Прыгавор суда пры дапамозе тэй-жа езуіцкай «філёзофіі» дакапваецца да карэньняў «нацыянальнага пытаньня»:

> «Чым, калі не варожасьцю да неяўрэяў,—патэтычна пытае прыгавор, — можна вытлумачыць паводзіны яўрэйскага натоўпу... чым можна вытлумачыць тое, што на асобных праходжых польскіх студэнтаў у асобных частках гораду яўрэйскія групы нападалі, зьбівалі іх, у Вільні, дзе яўрэйскіх пагромаў ніколі ня было, дзе існуе вуліца Гаона, *) у Вільні, якая зьяўляецца калыскай Мицкевіча, тварца прыгожага вобразу яўрэя-патрыёта — Янкеля Цымбалёста. Быць можа гэта варожасьць да палякаў зьяўляецца рэфлексам тэй варожасьці, якая ўкаранілася ў яўрэйскія душы на цэлыя стагодзьдзі і не паморла яшчэ да гэтага часу — варожасьць да хрысьціянскіх народаў, якія спальвалі іх на кастрох або забівалі іншымі сродкамі.
>
> Выступленьне часткі польскай моладзі ва унівэрсытэце супроць яўрэйскіх студэнтаў было толькі маслам на агонь гэтай варожасьці, якая гарыць у яўрэйскай душы».

Гэта «абгрунтаваная артумэнтацыя» «яўрэйскай варожасьці», якая зьяўляецца разам з тым апраўданьнем пагрому над яўрэямі і замазваньнем пагрому над яўрэйскім студэнцтвам у Вільні, дала суду «ідэйную і маральную» аснову паўтарыць у 1932 годзе, у польскай дэмакратычнай рэспубліцы, амаль стэрыатычна прыгавор царскіх катаў у справе Бэйліса, — суд знайшоў «віну Вульпіна зусім даказанай», суд знайшоў варожасьць яўрэяў да хрысьціянскі даказанай, суд знайшоў, што пагромныя справы эндэцкіх вярэл на вуліцах г. Вільно не даказаны. Ці можна пасьля гэтага сумняваць ў «глыбокай справядлівасьці» судовых органаў фашысцкай Польшчы?

Ясна, што гэты прыгавор суда, абнародаваны ў друку, паслужыў новым штуршком для стымуляваньня пагромнай агітацыі. Непасрэдна пасьля гэтага прыгавору «Газэта Варшаўская», камэнтуючы рэзультаты працэсу, пісала:

> «...мы разумачвалі, што імкненьні польскай акадэмічнай моладзі ў процантнай норме для яўрэяў ЗУСІМ АБГРУНТАВАНЫ І СПРАВЯДЛІВЫ, што барацьба, якую вядзе моладзь за «нумерус клаўзус», ХАЦЯ ГЭТА НЕАДНАРАЗОВА ПАВІННА БЫЛО ПРЫНЯЦЬ ГРУБЫЯ ФОРМЫ, нідзе і ніколі ня прымала характару крывавых вулічных эксцэсаў па віне польскай моладзі».

Такім чынам прыгавор Віленскага суда паслужыў для фашысцкага друку новым стымулам распальваньня барацьбы супроць праяўленьня яўрэйскай моладзі ў сьцены унівэрсытэту. Ці адчуваюць гэтыя «указаньні» фашысцкага друку патрэбу ў якіх-небудзь камэнтарах? Зразумела, што гэта пагромная агітацыя служыць працягам антысэміцкай сыстэмы ў галіне эканомікі і палітыкі, зьяўляецца зьвяном у агульным ланцугу тэрарызаваньня мас яўрэйскага працоўнага насельніцтва, зьяўляецца ланцугом усёй палітыкі цкаваньня ў адносінах да прыгнечаных нацыянальнасьцяй.

Яўрэйскі буржуазны друк Польшчы зразумела не адважваецца і ня хоча поўным голасам гаварыць аб пагромных падзеях і іх выніках. Гэты прадажніцкі друк, які цалкам падтрымлівае фашысцкую сыстэму і толькі з меркаваньня маскіроўкі часам фрондэруе запазыцыйнымі бяззубымі заявамі аб невыстарчальнай увазе да патрэб яўрэяў, гэты друк у сувязі з віленскім прыгаворам тое і робіць, што заклікае да... польскага фашысцкага правасудзьдзя. Беластоцкая газэта «Унэвэр Лебен» піша: «Успаміная ніцца парыскі працэс над Шоламам Шварцбардам, які застраліў яўрэйскага пагромшчыка Пятлюру... Парыскі суд прыняў пад увагу яго нацыянальную крыўду і зьняў з яго крымінальную адказнасьць за зроблены ім крывавы акт. **Будзем спадзявацца, што вышэйшы суд зразумее, што самаабарона не зьяўляецца пагромам і што за самаабарону не належыць садзіць у турму».** Ці можна прыдумаць больш рабскі тон, чым тон гэтага звароту яўрэйскай буржуазнай газэты?

Аднак і ў гэтых газэтах мы знаходзім «сьпіс дабрачынстваў» польскіх пагромшчыкаў, ня гледзячы на бяззубую крытыку і адсутнасьць вывадаў. А «сьпіс дабрачынстваў» у польскіх фашыстаў даволі доўгі наконт пагромных спраў. «Яшчэ сьвежы ўспаміны аб забітых, замучаных і зьняважаных яўрэяў ня толькі па Украіне, але і ў Польшчы, перад вачамі стаяць пабітыя дзяўчыны, студэнты і студэнткі, выкінутыя з зал-чытальнь, скінутыя са сходаў..., яшчэ не забыты страшэнныя дні ўзяцьця Вільно (гэта — пры адходзе Чырвонай арміі і прыходзе польскіх легіянэраў. — Х. Д.), кроў Вайтэра, якая яшчэ не перастала кішець, як усякая кроў нявіннай ахвяры». Аб гэтых вэчах ведае яўрэйскі буржуазны друк, але гаворыць ён пра іх з сарамлівай баязьлівасьцю. Але гэты «сьпіс» можна было-б бясконца прадоўжыць, хаця-бы расказамі аб пагромах польскіх фашысцкіх студэнтаў у Кракаве і аб тым, што за забойства яўрэяў у гэтым пагроме забойны былі аштрафаваны ад 10 да 30 злотых і г. д.

***

У газэце «Момент» за 12 мая г. г. зьявілася вялікая справаздача пад загалоўкам «цяжкае становішча яўрэяў у краінах Усходняй Эўропы». У гэтай справаздачы газэта перадае даклад Леапарда Монтыфёры на пасяджэньні «Англо-Джуіш Асосейшн» (англа-яўрэйскай асацыяцыі) у Лёндзне. У сваім дакладзе Монтыфёры гаварыў аб становішчы яўрэяў Усходняй Эўропы і закранаючы становішча польскага яўрэйства, ён сказаў: «Няма ніякага сумненьня, што жаданьнічае становішча ўсёй Усходняй Эўропы, асабліва Польшчы, сапраўды цяжкае. Падзеньне цэн на сельска-гаспадарчыя прадукты паменшыла пакупную здольнасьць селяніна і ў рэзультаце цярпіць таксама яўрэй...» З прамоў у сойме можна зрабіць вывад, што яўрэйскія прадстаўнікі прытрымліваюцца тэй думкі, што хаця пяперашні рэжым, натуральна, не зьяўляецца філёсэміцкім, **аднак, ён лепш усякага іншага рэжыму.** Што-ж датычыцца эканамічнага выцясненьня яўрэяў, дык Монтыфёры дадае ў канцы, што «патрэбна быць сумленным і **заўсёды мець на ўвазе труднасьці польскага ўраду».**

Больш празрыстай заявы, якая гаворыць, з аднаго боку, аб прычынах пагромаў і наогул сыстэме эканамічнага і фізычнага тэрору над яўрэйскім насельніцтвам, і, з другога боку, аб ролі яўрэйскай буржуазіі ў фашысцкай Польшчы, — больш празрыстай заявы чым тая, якая перадаецца ў відзе дакладу ў яўрэйскіх буржуазных газэтах Польшчы, ня можа быць. Мы даведваемся, што яўрэйскія прадстаўнікі ў польскім сойме лічаць, што антысэміцкі рэжым зьяўляецца лепшым, чым які-небудзь іншы рэжым, яўрэйскі буржуазны друк лічыць, што патрэбна «сумленна ўлічваць труднасьці польскага ўраду». Якая справа яўрэйскаму буржуазнаму друку, што ў Вільні і ў іншых гарадох грамяць яўрэйскіх працоўных, катуюць моладзь. Наадварот: наўжо не ў яе, буржуазіі, інтарэсах захаваць фашысцкую палітыку, узмацніць націск на рабочых і працоўных, задушыць усякі палітычны і культурны рух мас. Зразумела, што яўрэйская буржуазія і разам з ёю сацыял-фашысцкі «Бунд» у тэй ці іншай форме цалкам падтрымліваюць пагромных спраў майстроў. З пункту гледжаньня клясавай барацьбы нічога дзіўнага і супярэчлівага няма ў тым, што яўрэйская буржуазія аказалася сярод «майстроў» яўрэйскіх пагромаў.

Ёсьць толькі адна сіла, якая можа пакончыць з зоалёгічным антысэмітызмам, хуліганскай разьнёй і езуіцка-прыкрытым сярэднявякоўем, якое пануе ў Польшчы і дзейнічае ў інтарэсах эксплёататарскіх клясаў, гэта сіла — рабочая класа, працоўныя масы, якія змагаюцца пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі Польшчы, камуністычнай партыі Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, за зьвяржэньне сыстэмы эксплёатацыі, за зацьверджаньне пралетарскай дыктатуры. Гэта сіла ўсё больш і больш расьце ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы і арганізацыі мас на аснове гэтай барацьбы для рашучых баёў супроць фашызму. Толькі гэта сіла пакончыць з ганебнымі справамі пагромшчыкаў, толькі гэта сіла згуртуе масы рабочых і працоўных усіх нацыянальнасьцяй Польшчы ў адзін адзіны фронт.

*) Гаон — тварэц і правадыр рэакцыйнай сэкты сярод яўрэяў

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

ПРЫГАРАДНЫ САЎГАС ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА АРГАНІЗАВАЎ ТРУСАГАДОЎЧУЮ ФЭРМУ

ПРАКТЫКУ ДЗЯРЖЫНЦАЎ—ВА УСЕ ПРЫГАРАДНЫЯ КАЛГАСЫ І САЎГАСЫ БССР

Прыгарадныя саўгасы і калгасы могуць і павінны адыграць вялізарную ролю ў разгортваньні трусагадоўлі і забясьпечыць працоўных гораду добраякасным спажыўным мясам труса і разам з гэтым павялічыць сырцовую базу футраскураной прамысловасьці.

Дагэтуль сярод многіх гаспадарнікаў існуе думка, што трусагадоўля — нярэнтабельная справа. Але ці так гэта ў сапраўднасьці? Для прыкладу возьмем гаспадарку, якая мае 100 трусаматак і 10-12 трусоў-вытворнікаў. Для такой колькасьці дарослых трусоў на працягу году патрэбна кармоў: моцных (аўса, высевак і іншых)—27-30 цэнтн., грубых (сена, галінкі дрэў, лісьця) — 35-36 цэнтн., кораньплодаў (буракоў, бручкі, морквы) — 40 цэнтн.

Ад кожнай маткі мінімальна можна атрымаць на працягу году ня менш 12 штук маладняка. Значыць 100 трусаматак на працягу году могуць даць ня менш 1.200 шт. таварнага маладняка. Для адкорму яго на працягу 5-6 месяцаў пасьля ад'ёму ад матак патрэбна 90 цэнтн. моцных кармоў, 140 грубых, 140 кораньплодаў і 3 цэнтн. малака, якое даецца толькі слабым трусятам. Прычым, у летні час як дарослым, так і маладняку кораньплоды і сена можна з посьпехам замяніць сьвежай травой і батвой ад гародніны. Пэўную колькасьць кармоў можна з'эканоміць яшчэ скарыстаньнем розных адкідаў гаспадаркі, якія з посьпехам могуць пайсьці на корм трусам.

Для абслугоўваньня такой трусагадоўчай гаспадаркі (фэрмы) патрэбен адзін пастаянны рабочы, практык-трусавод і 1-2 падлеткі для дапамогі ў часе масавых акролаў.

Такая трусагадоўчая фэрма дасьць мінімальна 2.400 кілёграм мяса, 1.200 скурак і 10-12 кілёграм пухавоўны. **Мясам гэтых трусоў можна задаволіць патрэбы 32-35 чалавек на працягу ўсяго году з разьліку па 6 кгр. у месяц на асобу.**

Валавы прыбытак ад трусагадоўчай фэрмы дасягне 7.200—7.500 руб., а выдатак — 6.000 руб., з іх на карм 1.785 руб., будынкі — 2.125 руб. і зарплату — 2.000 руб. Адсюль чысты прыбытак будзе 1.200—1.500 р. (лічбы акруглены).

Выходзячы з гэтых меркаваньняў, прыгарадны саўгас **ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА, Віцебскага раёну,** прыступіў да арганізацыі трусагадоўчай фэрмы. У суседнім саўгасе **«Новы шлях»** (які не жадаў займацца трусагадоўляй) налічыцца 111 трусоў, з якіх 93 шт. трусаматак. Трусы былі куплены ў сярэдзіне красавіка. Усе яны былі вельмі худыя, змораныя, частка іх была хворая. Усё гэта ў выніку дрэннага догляду і нездавальняючага кармленьня.



Трусатнік жанту № 6. Труса-матка «Ангельская бабачка» з прыплодам. Акроп быў 10 красавіка.

За кароткі тэрмін (тры тыдні) трусы настолькі зьмяніліся, што дырэктар саўгасу «Новы шлях», дзе яны раней былі, нават не пазнаў іх. Зараз трусы маюць добры выгляд, сярэднюю сытасьць і зусім не хварэюць. За ўвесь час ня было ні аднаго выпадку падзяжу. Тлумачыцца гэта добрым іх утрыманьнем, правільным доглядам і кармленьнем.

Разам з трусамі было куплена 29 шасьцімясцовых клетак на 174 штукі. Клеткі, а таксама і дробны інвэнтар (паілкі і кармушкі) былі добра прадэзынфэкаваны і пабелены вапнай. Клеткі знаходзяцца на вольным паветры ў садзе. Кормяць трусоў па нормах, кожнаму трусу даецца штодзенна 60-70 грам аўса, 80 грам. сена, 70 гр. кораньплодаў. Падсосным маткам даюць па 20-30 гр. малака.

Даглядае трусоў аматар-трусавод тав. Рудзінт, які мае ўжо шматгадовую практыку. Тав. Рудзінт абслугоўвае 113 клетак бяз усякай дапамогі. Ён заяўляе, што нікому не дазволіць даглядаць трусоў, пакуль не прывядзе пагалоўе у належны выгляд. Зараз у трусатніку праводзіцца масавая злучка. Дзьве маткі ўжо далі першы акрол па 7 шт. кожная.

Вопыт арганізацыі трусагадоўлі ў саўгасе імя Дзяржынскага трэба перанесьці і ва ўсе іншыя прыгарадныя саўгасы і калгасы.

Кожны саўгас або калгас, які мае малочную фэрму, з посьпехам без вялікіх лішніх затрат можа гадаваць пры гэтай фэрме трусоў як для сваіх патрэб, так і для продажу.

Глушакоў.

На аснове папулярызацыі і рэалізацыі пастановы ЦК і СНК перамагчы адставаньне ў мясазагатоўках

Пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб пляне жывёлазагатовак, аб мясным гандлі калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў працоўных сялян мае вялізарнае гаспадарча-палітычнае значэньне.

Акрамя скарачэньня пляну жывёлазагатовак, пастанова стварыла магчымасьці пры здачы мяса замяніць адзін від жывёлы другім.

Побач з дзяржаўнымі загатоўкамі для цэнтралізаванага снабжэньня, вялізарнае значэньне набывае разгортваньне гандлю жывёлай і мясной прадукцыяй калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Гэта-ж пастанова падкрэсьлівае недапушчальнасьць яжіх-бы там ні было абмежаваньняў па забоі жывёлы як для ўласных патрэб сельскага насельніцтва, так і для продажу на рынку і праз калгасныя магазыны.

Па БССР плян на тры кварталы 1932 г. зьменшан з 45.100 тон да 38 тыс. тон.

Ход жывёлазагатовак паказвае, што некаторыя раённыя арганізацыі і работнікі не зразумелі сэнсу пастановы ЦК і СНК і, замест правядзеньня шырокай растлумачальнай работы па выкананьні цэнтралізаванага пляну, фактычна згарнулі загатоўкі.

Рад раёнаў сыстэматычна зрывае пляны. На 10 мая, напрыклад, **Брагінскі, Буда-Кашалёўскі, Бягомльскі, Веткаўскі, Чырвонапольскі, Клічаўскі, Лоеўскі, Нараўлянскі, Петрыкаўскі, Вузьдзенскі і Чачэрскі** раёны рэалізавалі зусім мізэрны процант пляну.

Нельга сказаць, што арганізацыі паказаных 11 раёнаў не займаліся пытаньнем аб мясазагатоўках. Раённы друк таксама друкаваў артыкулы аб жывёлазагатоўках. Але-ж лічбы пацьвярджаюць, што ўся гэта работа засталася толькі на паперы, што займаліся алілюйшчынай.

Вопыт перадавых раёнаў паказвае, што пастанова ЦК КП(б)Б і СНК аб ходзе мясазагатовак бязумоўна можа быць выканана пры сапраўднай бальшавіцкай рабоце.

Так, Сіроцінскі раён на 10 мая здаў 85 проц. пляну, Бярэзінскі—53 проц., Мсьціслаўскі—43 проц., Касьцюковіцкі, Менскі, Слуцкі, Старобінскі і Чэрыкаўскі раёны—па 35 проц.

Яшчэ лепшы прыклад дае Чашніцкі раён, які на 5 мая здаў усяго 7 проц. пляну, а насьля пастановы ЦК і СНК БССР дабіўся да 10 мая выкананьня квартальнага пляну на 33 проц. пры сярэднім процанце па БССР у 21,6.

Трэба адзначыць, што адстаючыя раёны па колькасьці стада жывёлы маюць усе магчымасьці разгарнуць мясазагатоўкі. Раённым кіруючым арганізацыям трэба праверыць загатоўчы апарат, выкінуць адтуль усё непотрэбнае, прымусіць загатапарат працаваць на аснове разгортваньня масавай работы так, як гэтага патрабуюць інтарэсы рабочага снабжэньня.

Павінна быць разгорнута самая шырокая масавая работа аб значэньні пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК аб жывёлазагатоўках з тым, каб яна стала вядомай кожнаму калгасьніку і аднаасобніку—бедняку і сераднняку, увяз ваючы ўсю гэту работу з пасьпяховым правядзеньнем сяўбы.

Рашал.

Не здаваць тэмпаў у мабілізацыі сродкаў!

Ход мабілізацыі сродкаў у другім квартале адрозьніваецца ад ходу выкананьня фінпляну першага кварталу тым, што, якасьць фінансавай работы значна палепшылася.

Калегія НКФ СССР, уручаючы БССР пераходны чырвоны сьцяг за перамогі па фінансавым фронце, адзначыла, што пры агульным перавыкананьні пляну першага кварталу, была новыстарчальна забясьпечана якасьць работы, нездавальняюча выконваліся дэкадныя і месячныя пляны.

І сапраўды. З пачатку кварталу тэмпы звычайна былі вельмі нізкія, яны ўзрасталі толькі пад канец кварталу, што, нарэшце, прыводзіла да перавыкананьня заданьняў. Такая работа выклікала перабой ў рэгулярным фінансаваньні народнай гаспадаркі.

Фінплян другога кварталу па БССР выконваецца больш нармальна, з меншымі перабоямі, кожная дэкада дае ў сярэднім рост у межах да 11 проц. На 1 мая БССР выканала звыш 37 проц. квартальнага пляну і выйшла як па гарадзкіх, так і па абавязковых плацяжох на першае месца па Саюзе. **Да 10 мая фінплан другога кварталу выкананы на 45,5 проц.** Нарастаньне тэмпаў ідзе. Але высунуты трамадзкасьцю БССР сустрэчны плян выкананьня да 1 мая 50 проц. квартальнага заданьня—не рэалізован нават па 10 мая.

Асобныя гарады і раёны цьвёрда трымаюць у руках ганаровы чырвоны сьцяг. Да іх адносіцца **Жытковіцкі** раён, які змагаецца за першынства ў БССР. **Тураўскі**, Заслаўскі, Жлобінскі, Бабруйскі, Старобінскі, гарады **Менск і Віцебск**, Лепельскі, Магілеўскі, Сіроцінскі, Чырвонаслабодзкі, Слуцкі, Асіпавіцкі, Гомельскі, Мазырскі раёны. **Яны да 10 мая выканалі ад 31,8 проц. да 48,4 проц. квартальнага пляну.** Наганяюць тэмпы і такія раёны, як Лельчыцкі, Быхаўскі, Полацкі, Чырвонапольскі, Барысаўскі, якія выканалі плян ад 47,8 да 44 проц.

Гэтыя абедзьве групы раёнаў на аснове шырока разгорнутага міжраённага сацспаборніцтва, мабілізавалі грамадзкасьць, стварылі фінансавы актыў, правялі вялікую масавую работу вакол фінпляну. Калі яны не аслабяць у далейшым работу, можна быць упэўненымі, што яны выкананюць сустрэчны плян — рэалізуюць квартальнае заданьне да 10 чэрвеня. Але ёсьць рад раёнаў, якія паказваюць зусім агідныя, чарапашыя тэмпы мабілізацыі сродкаў, закінулі гэту справу, адділі яе пад уладу самацёку, і стваравюць пагрозу агульнаму выкананьню фінансавага пляну БССР. Да іх адносіцца **Бешанковіцкі** раён, які на 10 мая выканаў толькі 17,9 проц. пляну і якому прысуджан пераходны рагожны сьцяг, Хойніцкі, Уваравіцкі, Церахаўскі, Нараўлянскі, Прапойскі, Сеньненскі, Стара-Дароскі, Веткаўскі, Лоеўскі, Глускі, Расонскі, Талочынскі, Касьцюковіцкі і інш., якія выканалі ад 20 да 30 проц. квартальнага заданьня.

Задачы бесьперабойнага фінансаваньня народнай гаспадаркі, вёсьвавой слёзы, капітальнага будаўніцтва патрабуюць неадкладнага пераключэньня адсталых раёнаў на бальшавіцкія тэмпы. Так далей працаваць нельга!

Брандабоўскі.

ЧЫГУНАЧНІКІ БССР АДКАЗАЛІ НА ЛІСТ НЯМЕЦКІХ РАБОЧЫХ КАНКРЭТНЫМІ СПРАВАМІ

Сваё пралетарскае абяцаньне выканалі

ВОРША. (Наш кар.). Абавязацельствы, якія ўзялі на сябе чыгуначнікі Аршанскага дэпо ў адказ на ліст нямецкіх рабочых вагонна-рамонтнага заводу г. Кірхмэзэра, выкананы поўнасьцю.

Да 1-га мая быў выпушчан звыш пляну з абточкі паравоз СУ-9765 і з кансэрвацыі Щ-5030. Выпушчана з рамонту звыш пляну 6 вагонаў. Па дэпо Ворша-Ўсходняя таксама выпушчан звыш пляну з прамывачнага рамонту адзін паравоз і з сярэднягa рамонту адзін вагон. Праведзена абсталяваньне дэпо Ворша-Ўсходняя. 24 красавіка быў наладжан масавы суботнік па ачыстцы дэпо і вакол дэпо. Праведзена самаправерка сацспаборніцтва і ўдарніцтва па ўсіх брыгадах і зьменах.

Для папулярызацыі лепшага вопыту перадавых брыгад праведзены 2 вытворчыя нарады абмену вопытам. Вопыт работы спаранай брыгады СУ-9872 — **Аляксеева і Славуціна,** атрымаўшых назву лепшых машыністаў СССР, перадаецца ўсім паравозьнікам праз насьценгазэты, шматтыражку, праз правядзеньне вытворчых нарад. Лепшыя машыністы прымацаваны да адстаючых. Таксама прымацаваны ўсе інжынэрна - тэхнічныя работнікі да паасобных паравозных брыгад.

Поўнасьцю рэалізаваць самаабавязацельствы

Прапрацоўка ліста нямецкіх рабочых Кірхмэзэраўскіх вагонна-рамонтных майстэрань на Менскім чыгуначным вузьле дала значныя палітычна-гаспадарчыя вынікі.

Партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі, разгарнуўшы работу па рэалізацыі канкрэтных абавязацельстваў, прынятых рабочымі ў адказным лісьце, які быў надрукован у «Зьвязьдзе», дабіліся раду посьпехаў.

Сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам зараз ахоплена 96 проц. усіх рабочых супроць 60 проц. у першай палове красавіка. Поўнасьцю зьнішчаны спазьненьні пасажырскіх цягнікоў, паўторнасьці рамонту і здарэньні ў дарозе. Ня было ні аднаго выпадку недадачы або спазьненьня паравозаў пад цягнікі. Калі процант зрыву спаранай язды ў сакавіку складаў 3,3, дык за апошні час ён даведзен да 1,6.

Значна павялічылася карысная работа паравоза. Па заданьні паравоз павінен працаваць 8,3 гадзіны, зараз паравозьнікі, змагаючыся за выкананьне свайго абавязацельства перад кірхмэзэраўскімі рабочымі давялі карысную работу паравоза да 10,6 гадзін.

Большасьць рабочых прайшлі 56-га дзённы курс вайсковай падрыхтоўкі.

Разам з гэтымі дасягненьнямі ёсьць і недахопы. Кіраўніцтва вузла да гэтага часу не забясьпечыла інжынэрна-тэхнічнымі работнікамі тэхнічную кансультацыю для рабочых пры чыгуначным клюбе. Ня выканана абавязацельства і адносна інтэрнацыянальнага выхаваньня. Ня зьнішчаны яшчэ спазьненьні **таварных** цягнікоў. Процант хворых паравозаў некалькі перавышае заданьне. Задана 12 проц., выканана—12,8 проц.



Ударнікі рамантуюць паравоз у звыш нармовы час

П. Н.

ЦЭНТРАЛЬНЫМ І РАЁННЫМ ГАЗЭТАМ, ФАБРЫЧНА-ЗАВОДЗКІМ

і транспартным шматтыражкам

Ліст культпропу ЦК КП(б)Б ад 16 мая 1932 г.

Адзначаем, што значная частка цэнтральных і нізавых газэт БССР нездавальняюча выконвае задачы, пастаўленыя ў лісьце сакратара ЦК КП(б)Б т. Рыскіна да рэдакцый газэт, які разасланы 2 месяцы таму назад.

Значная частка газэт не аддае выстарчальнай увагі пытаньням рабочага снабжэньня, культурна - бытавога абслугоўваньня шырокіх працоўных мас.

Галоўны недахоп, асабліва часткі фабрычна-заводзкіх і раённых газэт, заключаецца ў тым, што газэты ставяць гэтыя пытаньні «наогул», ня ўмеюць увязваць «Дробныя» пытаньні брыгады, цэху з агульнымі задачамі ўсяго заводу, усёй савецкай краіны. Некаторыя асобныя газэты зусім абыходзяць на сваіх старонках пытаньні штодзённых запатрабаваньняў рабочых, не растлумачваюць наяўныя труднасьці нашага росту.

Рад газэт не пакладзі ў аснову сваёй работы ўсе шэсьць умоў тав. Сталіна. Напрыклад, некаторыя газэты змагаюцца толькі з ураўнілаўкай, не аддаючы ўвагі барацьбе за естатнія ўмовы т. Сталіна. Рэдакцыі гэтых газэт не разумеюць, што ўсе шэсьць умоў тав. Сталіна паміж сабою арганічна зьвязаны.

Частка газэт усё яшчэ ня ўмее гэтыя шэсьць гістарычных умоў тав. Сталіна перавесьці на канкрэтную мову канкрэтных разгорнутых мерапрыемстваў унутры свайго заводу, сталовай, магазыну і г. д.

КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б, падтрымліваючы ініцыятыву газэты «Рабочий» па арганізацыі ўсебеларускага сталінскага паходу за паляпшэньне рабочага снабжэньня (матар'ялы апублікаваны ў газэце «Рабочий» за 13 мая), ПРАПАНУЕ:

Усяму цэнтральнаму, раённаму і фабрычна-заводзкаму друку ўключыцца ў гэты паход. Рэдакцыям газэт неабходна выпрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па правядзеньні паходу і ўцягненьні шырокіх працоўных мас, у тым ліку і жонак рабочых, у барацьбу за паляпшэньне рабочага снабжэньня і культурна-бытавога абслугоўваньня, за разгортваньне тавараабароту, максымальнае разгортваньне самазагатовак, арганізацыю сьвінаадкорму, трусагадоўлі, арганізацыю калгаснага гандлю, максымальнае разгортваньне гандлёвай сеткі, за выкананьне пасеўных плянаў у прыгарадных гаспадарках і выкананьне апошніх пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб збожжа- і мясазагатоўках.

Культпропам ГК і РК КП(б)Б Віцебску, Гомелю, Барысава, Бабруйску, Магілева, Рэчыцы і іншых прамысловых цэнтраў разам з рэдакцыямі гарадзкіх газэт неабходна склікаць шырокія нарады рэдактароў фабрычна - заводзкіх газэт для абмеркаваньня праграмы правядзьння ЦСПСБ, газэты «Рабочий» і Белкаапсаюзу, намеціўшы канкрэтныя пляны правядзеньня рэйдаў і грунтоўнай папярэдняй падрыхтоўкі да іх.

БелТА забясьпечыць рассылку раённаму і фабрычна-заводзкаму друку матар'ялаў аб мэтах паходу, а таксама забясьпечыць дасылку ўсяму цэнтральнаму і раённаму друку БССР штодзённых апэрацыйных зводак і іншых матар'ялаў аб разгортваньні і канкрэтных рэзультатах паходу.

ДАРУЧЫЦЬ БДВ разам з рэдакцыяй газэты «Рабочий» у пяцідзённы тэрмін, пры ўдзеле Белкаапсаюзу і ЦСПСБ, выдаць масавым тыражом лёзунгі па пытаньнях месячніка для распаўсюджваньня на прадпрыемствах, у сталовых, каапэрацыйных крамах і г. д.

КУЛЬТПРОПАМ ГАРКОМАЎ заслухаць у выбарчым парадку даклады рэдактароў насьценгазэт прыгарадных гаспадарак пад кутом выкананьня нізавым друкам тэлеграмы сакратара ЦК т. П. КАЛО аб скончэньні сяўбы ў прыгарадных гаспадарках да 25 мая. Таксама лічыць неабходным выданьне макетаў насьценных газэт для прыгарадных гаспадарак.

ДАРУЧЫЦЬ ГАЗЭТАМ «РАБОЧИЙ» І «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» на працягу месячніка правесьці нарады рэдкалегій насьценных газэт магазынаў, сталовых.

ДАРУЧЫЦЬ РЭДАКЦЫЯМ ЦЭНТРАЛЬНЫХ РАДЫЁ - ГАЗЭТ правядзеньне перакліч прадпрыемстваў, магазынаў, сталовых аб канкрэтных вынніках па месячніку і, у прыватнасьці, аб разьвіцьці трусагадоўлі.

Надаючы выключна важнае значэньне разьвіцьцю трусагадоўлі, абавязаваць усе без выключэньня цэнтральныя, раённыя і фабрычна-заводзкія газэты адгукнуцца на ініцыятыву «Правды» і забясьпечыць сыстэматычнае зьмяшчэньне на старонках газэты спэцыяльнага аддзелу, прысьвечанага барацьбе за масавае разьвіцьцё трусагадоўлі.

БДВ з удзелам Белкаапсаюзу выдаць серыю папулярных плякатаў і брашур аб трусагадоўлі.

Усю работу па месячніку неабходна праводзіць на высокім палітычным узроўні, пад знакам павышэньня ролі друку ў барацьбе за няўхільнае ажыцьцяўленьне шасьці гістарычных умоў тав. Сталіна, барацьбы на два фронты, супроць правага ўхілу — галоўнай небясьпекі, супроць «левых» загібаў і пры мірэнчых адносін да ухілаў, за паляпшэньне рабочага снабжэньня і выкананьне апошніх пастаноў партыі і ўраду аб збожжа- і мясазагатоўках, калгасным гандлі і новым законе аб с.-г. падатку.

Намесьнік загадчыка Культпропу ЦК КП(б)Б ЗАЛАТУХІН.
Заг. сэктару друку Культпропу ЦК КП(б)Б КУРЦІК.

У Беларускай Акадэміі Навук

Брыгады навуковых работнікаў на заводах і ў раёнах

* Для правядзеньня пляновай і сыстэматычнай масавай навукова-дасьледчай працы на фабрыках і заводах, да сямі наступных прадпрыемстваў гор. Менску: зав. імя Варашылава, «Бальшавік», «Польшча Рэвалюцыі», зав. імя Молатава, «Камунар» і «Эльвод» пры Менскім ЦСУ, ЦСУ, ЦСУ,

ПРАВАКАЦЫЙНЫЯ ВЫДУМКІ ЛОПАЮЦЦА АДНА ЗА ДРУГОЙ

ПАРЫСКАЯ АХРАНКА—АЎТАР ФАЛЬШЫЎКІ АБ „НЭОБАЛЬШАВІЗЬМЕ“

ФАШЫСТА ГАРГУЛАВА

Поўны правал вэрсіі аб „нэобальшавізьме“ Гаргулава

ПАРЫЖ, 16. Парыскі карэспандэнт «Пці Парызьен» паведамляе, што сьледзтва аб Гаргулаве, якое робіцца францускім камісарам паліцыі Эно, наближаецца к канцу. Вынікі сьледзтва ў Чэха-Славакіі зводзяцца да наступнага: «1) Сапраўднасьць асобы Гаргулава ня выклікае сумненьняў. Ён сапраўды ёсьць Паўла Гаргулаў, які нарадзіўся ў 1895 годзе ў станіцы Лабінскай; 2) Гаргулаў прыбыў у Чэха-Славакію з Польшчы ў 1921 годзе і асеў у Гадоніне. У 1927 годзе Гаргулаў прасіў аб натуралізацыі, але атрымаў адмаўленьне. Аднак, чэха-славацкі ўрад не адносіўся да яго, як да непажаданага чужаземца, бо ён даў Гаргулаву стыпэндыю па яго просьбе; 3) Гаргулаў быў жанаты тройчы і, акрамя таго, жыў бяз шлюбу з жанчынай старэй за 50 год, прозьвішча якой Олдрыска Галова; 4) у 1928 годзе Гаргулаў шукаўся паліцыяй па скарэе трэцяй жонкі — Стэпковай, у якой Гаргулаў украў пасаг, Іменна тады паліцыя зрабіла ў справе Гаргулава адзнаку, што ён зьяўляецца камуністам на падставе заявы Стэпковай, што яна бачыла ў Гаргулава білет камуністычнай партыі. Аднак, цяпер Стэпкова заяўляе, што апошняя яе заява была ілжывай. Камісар паліцыі Эно зьбіраецца дапытаць Стэпкову; 5) Другая і трэцяя жонкі Гаргулава характарызуюць яго, як п'яніцу і няўроўнаважанага чалавека; 6) у Парыжы Гаргулаў заявіў, што яго запісы аб камеры забіць Думэра ў 1930 годзе зьяўляюцца чыстай фантазіяй. Аднак, устаноўлен факт, што ў ліпені 1930 году Гаргулаў прасіў у францускім консульстве візу на паездку ў Парыж і атрымаў яе ў Празе; 7) камісар паліцыі Эно да гэтага часу ня мог устанавіць, што Гаргулаў належыў да якой-небудзь палітычнай партыі». Далей «Пці Парызьен» паведамляе, што «ў прыватных гутарках Гаргулаў называў сябе анархістам і лаяў правадыроў савецкай улады».

Гаргулаў ёсьць Гаргулаў

ПАРЫЖ, 16. «Юманітэ» ў артыкуле аб ходзе сьледзтва па справе Гаргулава, канстатуючы, што «за апошнія 48 гадзін агідная антысавецкая вэрсія францускага ўраду аб забойстве Думэра атрымала рад сьмяротных удараў», падкрэсьлівае, што «зараз усе ілжывыя выдумкі лопаюцца адна за другой.» На дольше пацьвердзілася, што Гаргулаў сапраўды белагвардзеец Гаргулаў. У памяшканьні Гаргулава знаходзяць яго студэнцкую кніжку, дзе фотаздымак забойцы засьведчан пячаткай царскай адміністрацыі — яшчэ адзін фармальны доказ, што забойца Думэра ёсьць белагвардзеец Гаргулаў. «Юманітэ» далей заяўляе: «Гаргулаў яшчэ ня быў членам кампартыі Чэха-Славакіі. Палітэйскія ілжэцы зьяўляюцца аўтарамі гэтай выдумкі».

«Калі верыць прэсе, — піша далей «Юманітэ», — трэцяя жонка Гаргулава, якую ён кінуў і абакраў, напісала паліцыі ліст, у дапісцы да якога Гаргулаў зьявіўся рукой, якая страляла, але мазгі, яе натхнялі і накіроўвалі, г. зн. сапраўдныя правакатары вайны, застаюцца на сваіх мясцох. Ілжывыя сьляды паліцыі не сабіюць нас, бо сапраўдныя сьляды вядуць у Парыж, дзе знаходзяцца сапраўдныя вінаватыя правакацыйнага забойства. (ТАСС).

* * *

ПАРЫЖ, 16. «Коцідзьен» піша: «Сьледзтва францускай паліцыі у Чэха-Славакіі, як відаць, пацьвярджае меркаваньне, што Гаргулаў вар'ят. Закранаючы вэрсію аб тым, што «Гаргулаў быў членам кампартыі», «Коцідзьен» адзначае, што гэта цьвердзжань не трымалася толькі на заяве трэцяй жонкі Гаргулава. Цяпер у сувязі з тым, што жонка Гаргулава адмаўляецца ад такой заявы, «няма ніякіх іншых вестак аб прыналежнасьці Гаргулава да якой-небудзь партыі».

Сапраўдныя вінаватыя правакацыйнага забойства сядзяць у Парыжы

ПАРЫЖ, 16. «Юманітэ» ў артыкуле тав. Бэрліоза падкрэсьлівае, што выкрыцьці «Юманітэ» расьсейваюць адну за адной ілжывыя выдумкі «ілжывай паліцэйскіх» ў справе Гаргулава таксама, як і фальшыўкі з Гаўра, з Прагі і з Румыніі. Тав. Бэрліоз піша: «Вядома, урад хацеў-бы знайсьці яшчэ якую-небудзь зачэпку, але, бачачы, што першы стрэл даў асечку, ён хоча чым хутчэй разьвязацца з гэтай брудной справай. Пакуль працуюць пакаяць белагвардзейскага забойцу вар'яттам, што дазволіць лічыць яго прыхільнікі ня маючымі ніякай вартасьці».

У канцы «Юманітэ» піша, што ўрад рэальчнае атрымаць значную выгаду ад гэтай справы, падтрымліваючы тэзіс аб ненармальным стане Гаргулава. Гэтым ён хоча ўтаіць той факт, што рускі фашыст быў у сапраўднасьці зброяй пэўнай палітыкі.

Арганізацыі францускай кампартыі патрабуюць выгнаньня белагвардзейцаў з Францыі

ПАРЫЖ, 16. «Юманітэ» паведамляе, што ў розных акругах Францыі мясцовыя арганізацыі кампартыі вядуць энэргічную кампанію адпору антысавецкай правакацыі ў сувязі з забойствам прэзыдэнта Думэра. Так, з Грэнобля перадаюць, што арганізацыя рускіх белаэмігрантаў, якая там знаходзіцца, вядзе вучэбныя заняткі па страляніне, а штаб арганізацыі штодзённа набірае белых эмігрантаў з мэтай адпраўкі іх у Манчжурыю для ваенных дзеяньняў супроць СССР. У дэпартаманце Альп Марыцім мясцовая камуністычная арганізацыя выпусьціла лятучку, у якой, падаючы той факт, што белагвардзейцы, якія пражываюць на Рыв'еры, абзавяліся ўласнай радыёвяшчальнай станцыяй, заклікае рабочых патрабаваць выгнаньня ўсіх белагвардзейцаў з Францыі. «Юманітэ» ў сваю чаргу заклікае ўсе акруговыя і раённыя арганізацыі партыі, а таксама паасобныя ячэйкі весьці работу па выкрыцьці злачынных дзеяньняў белагвардзейшчыны.

Каса п. Бэнэша заўсёды была адкрыта для белабандытаў

ПРАГА, 13. На пасяджэньні чэха-славацкага сэнату выступіў з прамовай камуністычны сэнатар Нэдвэд, які выкрывае цясьнейшую сувязь Гаргулава з чэха-славацкімі коламі. «Забойца францускага прэзыдэнта,—сказаў Нэдвэд,—быў прынят чэха-славацкім урадам з адкрытымі абдымкамі. На працягу шмат год ён быў у Чэха-Славакіі госьцем і, паводле нашых дакладных вестак, за пэрыяд з 1922 году па 1927 год, калі яму была дазволена мэдычная практыка, атрымаў з бюджэту міністра міністэрства замежных спраў, г. зн. з бюджэту Бэнэша, у якасьці дапамогі звыш 50.000 чэскіх крон».

Закрапаўшы агульны рэжым, які існуе ў Чэха-Славакіі ў адносінах да рускіх белагвардзейцаў, тав. Нэдвэд сказаў: «Варта было ўсім гэтым людзям, якія прыйшлі сюды з Савецкага саюзу, гэтай бандзе авантурнікаў толькі заявіць—я вораг бальшавікоў, я гатоў вярнуцца ў патрэбны момант і змагацца супроць іх,—як перад імі зараз-жа адкрываліся салёны пана Крамаржа і каса пана міністра Бэнэша».

Незадавальненьне белагвардзейскімі агентамі

ПАРЫЖ, 17. Правалы пастаўляемых белагвардзейцамі «вэрсій» адносна Гаргулава выклікаюць незадавальненьне сярод пэўных францускіх колаў. «Лібэрта» скарджацца, на «труднасьці», якія сустракаюцца на шляху разьбліцтвання таямніцы Гаргулава. «Нясумненна, — піша «Лібэрта», — асноўныя перашкоды для высьвятленьня справы Гаргулава ставяць тыя арганізацыі, якія зацікаўлены ў тым, каб адмежавацца ад дзейнасьці забойцы. Трэба, аднак, прызнаць, што добрыя пажаданьні белых рускіх супрацоўнічаць у расьсьледаваньні, якое праводзіцца, замест таго, каб палегчыць сьледзтва, сваімі супярэчлівымі паказаньнямі ўскладняюць работу судзьдзям-сьледчым.

Як фабрыкуюцца фальшыўкі

ПАРЫЖ, 16. У якасьці ілюстрацыі правалу павейнай белагвардзейскай вэрсіі аб Гаргулаве, што ён не «сапраўдны» Гаргулаў, а «чакіст Залатароў», характарна паведамленьне, якое зьявілася 16 мая ў газэце «Пары Суар» з Гаўра. Вядомы сьведка Астахаў, які заяўляў, што ў Гаргулаве ён апазнаў бальшавіка Залатарова, у тутарцы з карэспандэнтам «Пары Суар» заявіў яму наступнае:

«Я, па-сутнасьці гаворачы, ніколі ня бачыў камісара Залатарова на пасадзе. Толькі пасьля майго ад'езду са станіцы Лабінскай у часе рэвалюцыі, я давядаўся аб назначэньні Залатарова старшынём савету, а калі я вярнуўся, Залатарова ўжо ня было ў Лабінскай. Пазьней, калі я паехаў у Галіцыю, я давядаўся, што Залатароў зноў знаходзіцца ў Лабінскай, так што да мяне дайшлі толькі неправераныя чуткі».

Газэта, каментуючы заяву Астахава, піша: «Такім чынам, упэўненасьць Астахава значна зьнізілася».

Грандыёзная палітычная масоўка рабочых і працоўных Менску

Учора 18 мая на стадыёне імя Дзесяцігодзьдзя вызваленьня Беларусі ад белапалякаў адбылася вялікая палітычная масоўка, у якой прымала ўдзел каля 100.000 рабочых і працоўных г. Менску.

Масоўка была адкрыта прадстаўніком менскага гарпрафсавету тав. ШУЛЬКІНЫМ, пасьля чаго спатканы бурнымі воплескамі З ДАКЛАДАМ АБ МІЖНАРАДНЫМ СТАНОВІШЧЫ ВЫСТУПІЎ ПЕРШЫ САКРАТАР ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО.

Пасьля дакладу на масоўцы адбыўся фізкультурны парад і футбольны матч МЕНСК—«КРАСНЫЙ ПУТИЛОВЕЦ» (ЛЕНІНГРАД).

Падрабязная справаздача аб масоўцы будзе дана ў заўтрашнім нумары.

Нарада рэдактароў газэт па пытаньнях Сталінскага паходу

21 мая, у 6 гадзін вечара, у памяшканьні ЦК КП(б)Б (другі паверх, пакой № 54) Культпропам ЦК КП(б)Б, пры ўдзеле газэты «Рабочий» склікаецца Усебеларуская нарада рэдактароў гарадзкіх і фабрычна-заводзкіх шматтыражных газэт па пытаньнях Усебеларускага Сталінскага паходу барацьбы за паляпшэньне рабочага снабжэньня.

На нараду выклікаюцца рэдактары наступных газэт:

«Палеская праўда», «Віцебскі Пралетары», «Камунар Магілеўшчыны», «Камуніст» (Бабруйск), «Бальшавік Барысаўшчыны», «Рэчыцкая Праўда», «Ленінскі прызыў», «Чырвоная Полаччына» і рэдактары фабрычна-заводзкіх і транспартных шматтыражак: «Сельмашац», «Вагранка» (Гомель), «Мэтрамонавец», «Чырвоная Дзьвіна», «За ленінскую кампэрацыю» (Віцебск), «Пралетарская ніва», «Чырвоны шпэйнік» (Бабруйск), «Чырвоны Барэзінец», «Гута» (Барысаў), «Чырвоная бракамолка» (Добруш), «За цэмэнт» (Крычаў), «Валадарац» (Магілеў), «Чырвоны дарожнік» (Полацак), «На сацыялістычных рэйках», «Ударнік» (Гомель).

На нараду таксама выклікаюцца рэдактары ўсіх фабрычна-заводзкіх газэт г. Менску.

КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б.

Катастрафічнае абвастрэньне крызісу ў Юга-Славіі

ВЕНА. З Белграду паведамляюць аб катастрафічным абвастрэньні эканамічнага крызісу ў Юга-Славіі. У сувязі з фінансавымі труднасьцямі што дзень закрываюцца ўсё новыя прадпрыемствы. Слынна работа амаль на ўсіх тэкстыльных фабрыках. Паводле афіцыяльных даных, лік банкруцтваў вырас параўнальна з мінулым годам больш, чым у два разы. Вываз у сакавіку зьнізіўся на 52 проц., увоз — на 55 проц. параўналь на з мінулым годам. У Загрэбе не атрымліваюць пэнсіі ня толькі дзяржаўныя служачыя і пэнсіянэры, але нават жандары і афіцэры. Апошняя паводка зрабіла да гэтага часу, паводле апошніх буржуазных эканамістаў, больш чым на 1 млрд. дынараў страт. Зноў затоплена 300.000 гэкт. пасевах. У раёнах паводкі панае голад і эпідэмія.

Сялянскія паўстаньні ў Босьніі

ЛЮНДАН, 16. Паводле паведамленьня ваеннага карэспандэнта «Дэйлі Экспрэс», па ўсёй Юга-Славіі ўзьнімаецца хваля сялянскага руху, якая ўжо пракацілася па Краацыі і Славеніі і ахапіла ўсю Босьнію. «Басьнійскія сяляне, — піша газэта, — якіх апрычы крыўдзе падаткаў крыніц існаваньня, знаходзяцца ў стане адкрытага мяцежу. 2.000 сялян, пад кіраўніцтвам былога члена парляманту, штурмавалі ўрадавыя будынкі ў адным з галоўных гарадоў Паўночнай акругі, потым пайшлі ў горы. З Белграду высланы 600 паліцэйскіх, каб выбіць сялян з пазыцый. У другім месцы сяляне захапілі вагоны, грузілі іх збожжам для ўрадавых патрэб. У каменнавугольных капальнях Вагерыцы сяляне захапілі 145 фунтаў дынаміту».

Карэспандэнт паведамляе далей, што «ў Белградзе, дзе становішча было параўнальна спакойна, вялікую сам сацыю зрабіла выступленьне салдат. Незадаволеныя салдаты сабраліся перад каралеўскім палацам. Калі на бальконе зьявіўся король Аляксандр, дык салдаты сустрэлі яго крыкамі «ганьба». (ТАСС)

Чэрвонная шпонція — весткі з фронту індустрыялізацыі

Заканчваецца прыёмка 2-й домны

МАГНІТАГОРСК. Магнітагорская камсамольская домна № 2 прыводзіцца ў эксплёатацыйны стан. Канчаткова прыняты жалезамантажныя работы, кожух капальні, уся надкалашнікавая пабудова, нахілены мост. Заканчваюцца выпрабавальні скіпавых мэханізмаў.

Значная частка работ здана датэрмінова. Агнеўпорная кладка як самой домны, так і газапроводу прызнана прыёмачнай камісіяй поўнасьцю гатовай да эксплёатацыі.

Другі генэратар Дняпрабуду пастаўлен на выпрабаваньне

КІЧКАС. 15 мая ў 7 гадз. 10 мін. раніцы скончылася сушка другога самага магутнага генэратара Дняпрадрэсу. У 10 гадзін раніцы машыны пастаўлены на выпрабаваньне. Прыступлена да балянсаваньня ротара. Пасьля праверкі работы ўсіх частак, другі генэратар уступіць у эксплёатацыю.

Першы генэратар працуе бесьперабойна. Ён ужо выпрацаваў 770 тыс. кілёват-гадзін электраэнэргіі.

Сельгасмашыны

ГОМСЕЛЬМАШ за 13 мая выпусьціў 25 сіласарэзак «Папек»—76 проц., сячкарань—16 шт.—90 проц., бульбамялак—10 шт.—104 проц. і капюшпасартовак—2—50 проц.

* * *

За 13 мая «Чырвоны мэталіст» (Віцебск) выпусьціў макухадрабілак 18 шт., што складае 107,7 проц. заданьня, жарнярэзак—23 шт.—110,5 проц., бульбакапалак — 27 шт. — 92,4 проц. і плугоў балотных—3 шт. —176,4 проц.

Будматар'ялы

За 14 мая завод «Чырвоны Кастрычнік» (Ворша) вырабіў 10.340 кгр. будаўнічых цьвікоў, што складае 150,2 проц. сутачнага заданьня.

За 15 мая выраблена 6.760 кгр. будаўнічых цьвікоў—98,4 проц.

* * *

Лесасэх і завод № 7 Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату з 11 па 15 мая расьпілавалі 4.555 кбм. сыр-пу, што складае 90,6 проц. пляну. Цэх па вырабу стандартных дамоў выпусьціў 14 дамоў — 77,5 проц. пляну.

* * *

Лесазавод «Спартак» за 11, 12, 13 і 14 мая расьпілаваў сырцу 364 кбм., што складае 113,7 проц. чатырохдзённага заданьня.

* * *

За трэцюю пяцідзеўку мая дрэваапрацоўчы камбінат «Камінтэрн» расьпілаваў 8.879 кбм. сырцу, што складае 87,1 проц. заданьня.

Паперa

Папяровая фабрыка «Спартак» за 12 мая вырабіла 13 тон паперы, што складае 67,2 проц. сутачнага заданьня. Прастой машын—2 гадз. 35 мін. За 13 мая выраблена 15,3 кгр. паперы—83,1 проц. Прастой машын—5 гадз. 30 мін.

Угнаенні

На Крычаўскім фасфарытным заводзе за трэцюю пяцідзеўку мая выраблена 290 тон фасфарытнай мукі, што складае 62 проц. пляну.

Абутак

Гомельская абутковая фабрыка «Праца» за 11, 13 і 14 мая выпусьціла ўсяго 8.706 пар абутку, што складае 89,5 проц. трохдзённага заданьня. Выпушчана абутку хлапчуковага (яловкі) 1.533 пары—96,6 проц., ботаў 2.911 пар—91,1 проц., абутку хлапчуковага (выраст) 1.503 пары—87,1 проц., абутку мужчынскага 2.769 пар—85,5 проц.

* * *

Магілеўская гарбарня імя Сталіна за трэцюю пяцідзеўку мая дала прадукцыі на 60.913 р. — 76,9 проц. пляну.

Вопратка

За першую палову мая швэйная фабрыка «Прафінтэрн» (Віцебск) выпусьціла 10.900 польтаў для дзяўчат, што складае 105,7 проц. заданьня і 18.164 польтаў для хлапчукоў—97,4 проц. заданьня.

ПАСКОРЫЦЬ ПУСК ГОМЕЛЬСКАЙ ГУТЫ

Камісія выканаўня пры СНК БССР заслухала даклад аб ходзе будаўніцтва Гомельскай гуты. Камісія адзначыла, што яе пастанова ад 11 лістапада мінулага году аб пуску першай чаргі гуты 1 красавіка 1932 г. сарвана ў выніку нездавальняючых тэмпаў будаўніцтва і несваячасовага забесьпячэньня будматар'яламі і абсталяваньнем.

Кіраўніцтва Саюзшклофарфару ня ўлыла патрэбных захадаў да поўнага разьмяшчэньня ўсяго абсталяваньня, неабходнага для гуты. Дзяржплян БССР, б. ВСНГБ і кіраўніцтва Гомшклобуду ня выканалі дырэктыў аб забесьпячэньні гуты мясцовымі будаўнічымі матар'ялямі. Кіраўніцтва Гомшклобуду ня выканала пастановы камісіі аб пераводзе будаўнічых работ на прагрэсіўна-прэміяльную зьдельшчыну і не правяло работы па эканоміі будаўнічых матар'ялаў. Дырэкцыя гуты, парт'ячэйка і рабочкам не зьвярнулі належнай увагі на паляпшэньне матар'яльна-бытавога абслугоўваньня рабочых.

Камісія выканаўня абавязала начальніка будаўніцтва тав. Емельянава і дырэктара гуты тав. Амера максымальна ўзьняць тэмпы будаўніцтва з тым, каб не пазьней 15 чэрвеня г. г. скончыць лабудову інтэрнатаў, сталоўкі і драўляных дамоў. Дзяржпляну, НК лёгкай прамысловасьці і ўнаўнаважанаму Наркамзакраму даручана вызначыць патрэбныя Гомшклобуду мясцовыя будаўнічыя матар'ялы—300 тон вапны і 1.500.000 штук цэглы. (БЕЛТА).

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Рэдакцыя газэты „Зьвязда“ і ЦП саюзу грамадзкага харчаваньня склікаюць на 22 мая ў 7 гадз. вечара

нараду загадчыкаў сталовых г. Менску па пытаньні аб трусагадоўлі

Нарада заслухае даклад дырэктара Менскага трэсту грамадзкага харчаваньня т. Турэцкага аб вызначаных у гэтай галіне мерапрыемствах і абгаворыць практычныя пытаньні трусагадоўлі пры сталоўках.

На нараду павінны зьявіцца прадстаўнікі сталовых: ЖАКТУ № 6—тав. ЛЮСТЭРНІК і аматар - трусавод БУГАЕВА, з БЕЛКААПСАЮЗУ—спэцыяліст БІНАГРАДАЎ, з БЕЛТРУСАВОДТРЭСТУ — т. ГАЛУБЧЫК, з КАЛГАСЦЭНТРУ — т. БАГУШЭЎСКІ, загадчыкі сталовых № 1 — т. САГАЛОЎ, № 2—т. АКСЭЛЬРОД, № 3—т. ХАЗАН, № 4—ШАМЭС, № 5—РАГОЗІН, № 10—КРЫВАШЗЕЎ, № 11—Т. АСОБСКАЯ, № 12—т. ШУЛЬЦ, № 13 — т. ФРЫДЛЯНД, № 14 — т. ГУДЗІМАЎ, № 15—КАПЦЭВІЧ № 16—ЯДГУР, № 19—ОЗДЭР, № 21—ФІШКІН, № 23—ВАЙТАСЕВІЧ, № 25—ГАДМАЕР, № 29—БЭРШТЭЙН, № 32—ПАЛКОЎ, № 35—МАКСІМЕНКА, № 34—КІВОВІЧ, № 37—КАЗАК, № 40—ХОЦІН, № 41—МАЧАЛЬСКІ, № 43—БЯЗПРЫЗВАНЫ, № 44 — ХАРЫТОНЧЫК, № 48 — ВОЛЬЛЭР, № 49 — МЭЛЬЦЭР, № 50—ШАРШУН, № 52—ШАТКОЎСКІ, № 57—НЕКРАШ, загадчыкі ўсіх сталовых ТСТ чыгуначнікаў, прадстаўнікі Белкаапхарчу, харчэсяцы ТСТ чыгуначнікаў, усіх ЗРК і ЗВК.

Калі па якой-небудзь прычыне асобныя загадчыкі зьявіцца ня могуць, абавязкова прысутнасьць іх намесьнікаў.

Нарада адбудзецца ў габінэце рэдактара «Зьвязды» (Савецкая 63, 3-ці паверх).

РЭДАКЦЫЯ «ЗЬВЯЗДЫ».
ЦП САЮЗУ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ.

Сёньня, у 7 гадз. вечара, у Доме Камасьветы (былы клюб К. Маркса) Дзяржкарбітражам пры СНК з удзелам грамадзкасьці

будуць разгледжаны спрэчкі паміж выдавецтвамі „Зьвязда“, „Савецкая Беларусь“, ДВБ і Саюздрукам пры НК Сувязі

аб недахопах у распаўсюджаньні і дастаўцы газэт і часопісяй.

Запрашаюцца работнікі сувязі, выдавецтваў, упаўнаважаныя па друку на прадпрыемствах, рабкоры і чытачы газэт і часопісяй. Уваход вольны.

Дзяржкарбітраж пры СНК.

Наркампрацы БССР, ЦОПСБ і Менгарпрафсавет сумесна з сэктарам Дзяржпляну БССР

Сёньня у 5 гадз. вечара (памяшканьне Наркампрацы, Чырвонаармейская, 15)

склікаюць

нараду з удзелам прадстаўніка Наркампрацы СССР

па пытаньні

аб асноўных установах і мэтадалёгічных указаньнях па складаньні народна-гаспадарчага пляну па працы на другую пяцігодку.

ВЫКЛІКАЮЦЦА: члены камісіі па складаньні другой пяцігодкі і аддзелы эканомікі працы наркаматаў, абчэднаньняў, ведамстваў і цэнтральных арганізацый, сэктары плянаваньня і зарплаты ЦП саюзаў, Менскі Аддзел Працы, грамадзкія інспэктары, прадстаўнікі фабзаўкомаў і плянава-арэнацыйныя групы заводаў: імя Варашылава, „Камунар“, „Бальшавік“, дрэвазапрацоўчага заводу імя Молатава, шэйная фабрыкі „Кастрычнік“, цукрэйная фабрыка „Камунарка“ і менская абутковай фабрыкі.

Запрашаюцца прадстаўнікі масава-эканамічнага аддзелу ЦК ЛКСМ і прадстаўнікі газэт „Рабочий“ і „Зьвязда“.

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“

Ад 19 мая — Толькі 5 дзён

ЗНОЎ НА НАШЫМ ЭКРАНЕ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

ЗЛАТЫЯ ГОРЫ

У галоўных ролях: засл. арт. КОРВІН-КРУКОЎСКІ, РАЗУМАВА, ШТРАУХ, ГЭНІН, МІЧУРЫН І ПАСЛАЎСКІ.

ШТОДЗЕННА ТОЛЬКІ ТРЫ СЭАНСЫ.

Пачатак у 6 гадз., 8 гадз. 15 м. і 10 гадз. 30 м.)—(Каса—ад 4 гадз.

Дзеці ў кіно не дапускаюцца.

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“ — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ Ордэр на жыцьцё

ПРАЛЕТАРЫ — Мастацкі замежны фільм ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК.

„СПАРТАК“ Пач. 6-30, 8, 9-30, 11 Каса—ад 5 гадз. — З 18 мая новы фільм Гандляры славай Драма ў 6 частках.

БАБРУЙСКІ ЛЕСАТЭХНАЛЁГІЧНЫ ТЭХНІКУМ

абвешчае чарговы набор студэнтаў на першы курс аддзяленьняў: фанэрнага, сталярна-будаўнічага і лесапільнага.

Жадаючыя паступіць павінны падаць заявы на імя прыёмовай камісіі тэхнікуму па адрасе: г. Бабруйск, Савецкая, 76, лесатэхнікуму, з дадаткам усіх адпаведных дакумантаў, згодна існуючых правіл прыёму, не пазьней 25 жніўня 1932 г., далучаючы пры гэтым паштовых марак на 30 капеек.

Заняткі пачнуцца 10 верасьня.

Студэнты на 65 проц. ад агульнага ліку забясьпечваюцца стыпэндыяй у разьмерах 45 руб., а на стрэйных па 60 руб., а таксама інтэрнатам.

Дырэктар тэхнікуму Штыцко.

СЕНЬНЯ, у 7 гадзін веч., у памяшканьні Дому Чырвонай арміі адбудзецца

ПЛЕНУМ ГАРСАВЕТУ АСОАВІЯХІМУ.

Запрашаюцца члены пленуму, сакратары ячэек, актыў СПД, Чырвонага Крыжу, аўтадору, байцы вучэбных пунктаў АСО.

Гарсавет Асоавіяхіму.

ЗАГОТСЕНА пры Белканторы „Заготзерно“ прыступіла да складаньня плянаў забесьпячэньня спажыўцоў

АБ'ЁМФУРАЖОМ (сенам і саломай) на 1932-33 год,

а таму ўсе прадпрыемствы і ўстановы БССР, якія маюць уласны трансپарт, а таксама маюць патрэбнасьць у аб'ёмфуражы для розных мэтаў, павінны прадставіць Белканторы „Заготзерно“ абгрунтаваныя гадавыя заяўкі ў раённым і квартальным разрэзе для ўключэньня ў план забесьпячэньня іх аб'ёмфуражом з 1/VII—32 году па 1/VII—33 году.

Заяўкі належыць прадстаўляць па адрасе: Менск, Савецкая, 45, Белканторы „Заготзерно“ на пазьней 25 мая г. г.

Пасьля паказанага тэрміну заяўкі прымацца ня будуць.

Заготсена пры Белзаготзярно.

МЕНГАРКЫЛСАЮЗУ

ПАТРЭБНЫ на сталую працу

ТЭХНІК—адказны выканаўца на эксплёатацыі дамоў.

І ДОКТАР—спэцыяліст па санітарыі і дабрабыту.

Аплата па згодзе.

Адрас: Раваляцыйная, 15.

Буйнейшыя палітычныя дзеячы Японіі —за стварэньне нацыянальнага ўраду

ТОКІЁ, 17. Агенцтва «Дэмпо-Цусін», падсумоўваючы погляды буйнейшых груп верхняй палаты Колньюкай і Косейкай, указвае, што абедзьве гэтыя групы рашуча выказваюцца за стварэньне нацыянальнага ўраду. Гэтыя групы выказваюцца супроць спроб разбурэньня існуючага дзяржаўнага апарату, але лічаць, што «палітычныя дзеячы не павінны ігнараваць прычыны, якія выклікалі падзеі 15 мая». Вельмі магчыма, што ўдзельнікі тэрарыстычных актаў дзейнічалі з пачуцьця сапраўднага патрыятызму. З прычыны вельмі цяжкага ўнутранага і вьлешняга становішча ў Японіі задача выраўнаваньня цяперашніх ускладненьняў павінна быць даручана нацыянальнаму ўраду, які складаецца са здольных дзеячоў, незьвязаных партыямі. Абедзьве групы верхняй палаты выказваюцца за ўваходжаньне ва ўрад ваенных дзеячоў.

Адмірал Като ў інтэрв'ю з карэспандэнтам газэты «Хоці» заявіў, што «папяроднія ўрады не прынялі належных мер да выкараненьня «палітычнага крызісу», перад якім аказалася Японія пасьля манчжурскага інцыдэнту. Нацыянальная палітыка ажыцьцяўлялася хутчэй у інтарэсах палітычных партый, чым краіны». Като таксама выказаўся ў карысьць стварэньня нацыянальнага ўраду.

Арышты ўдзельнікаў замаху

ТОКІЁ, 17. Згодна паведамленьня «Сінбун Рэнго», учора паліцыя арыштавала 4 удзельнікаў замаху на ўзрыў электра і водаснабжэньня Токіё; сёньня арыштаваны яшчэ 3 удзельнікі готага замаху. Паліцыя ўказвае, што плян злачынцаў прадугледжваў зруйнаваньне ўсіх пастаўнцый і трансформатарных установак электрычных лініі, якія сьлівкалісь энергіяй Токіё. Частка змоўшчыкаў, што прымала ўдзел у замаху, спарылася. Усе змоўшчыкі — члены «Айкіокай» — арганізацыі моладзі прэфектуры Ібаракі. «Айкіокай», пад кіраўніцтвам нейкага Тацыбана, зьвязанага з кіраўніцтвам «лігі кроўнага брацтва», мае шмат прыхільнікаў у сельгаспрэфектуры Ібаракі, у якой сялянства знаходзіцца ў вялікі цяжкім становішчы. Паліцыя зрабіла вобыск у «прыватнай школе», якая кіруецца Тацыбана, і канфіскавала перапіску і літаратуру «Айкіокай». 13 мая Тацыбана схапілі. Сёньня высьветлілася, што 16 мая ён прыехаў у Мукдэн. (ТАСС).

Інспэкцыя румынскай арміі францускім генштабам

ВЕНА, 13. У сучасны момант у Румыніі знаходзіцца галоўны інспэктар францускай арміі генэрал Брэйе. Брэйе агледае і інспэктуе ваенныя арганізацыі і ўстановы румынскай арміі. Паведамляюць таксама аб прыбыцьці ў румынскі порт Констанцу 20 мая фрэйпускага навучальнага судна «Жанна Д'арк».

Польшча канцэнтруе войскі для захвату Данцыга

БЭРЛІН, 17. Германскія газэты паведамляюць, што ў самы апошні час ваенныя транспарты Польшчы праз Данцыгскую вобласьць прынялі формы, якія выклікаюць небясьпеку і зусім ня сьведчаць аб мірабубстве Польшчы. Разьмешчаныя каля Данцыга польскія пагранічныя гарады, у якіх раней зусім ня было войск; або былі толькі нязначнымі часьці, цяпер запоўнены польскімі войскамі. Галоўны вакзал Данцыга часамі нагадвае ваенны лягер, у прыватнасьці тады, калі пражываючыя ў Данцыгу салдаты ў форме, прушамі пакіроўваюцца ў пагранічныя раёны для ўдзелу ў манэўрах польскіх ваенных арганізацый. (ТАСС).

ЗАМАХ НА ЭГІПЭЦКАГА ПРЭМ'ЕРА

СТАМБУЛ, 10. 6 мая ў Эгіпце ля станцыі Ама на палатне чыгункі за некалькі мінут да праезду пягніка, у якім знаходзіўся эгіпэцкі прэм'ер Сідкі-паша, узарвалася машына. Узрывам забіты праходзіўшы чыгунку служачы. Паводле вестак газэт, машына па сьлеў сіле значна перавышае знарады, якія звычайна ўжываліся да гэтага часу эгіпэцкімі тэрарыстамі і магла-б зьнішчыць увесь склад цягніка. Эгіпэцкі прэм'ер выратаваўся толькі выпадкова, бо цягнік затрымаўся на некалькі мінут на папярэдняй станцыі. За апошнія некалькі месяцаў гэта ўжо трэці выпадак замаху на жыцьцё эгіпэцкага прэм'ер-дынтатара.

Правілы прыёму ва Усебеларускі палітыка-асьветны Інстытут на 1932-33 навуч. год.

(АСЕНЬНІ ПРЫЕМ)

1. Палітыка-асьветны Інстытут мае мэту падрыхтаваць палітасьветных працаўнікоў з вышэйшай кваліфікацыяй па асобных галінах палітасьветнай работы (раённыя інструктары і інспэктары палітасьветнай работы, загадчыкі палітасьветустаноў, супрацоўнікі навуковых бібліятэк, музэяў і інш).

У адпаведнасьці з гэтым пры інстытуце існуюць спэцыяльныя аддзяленьні:
1) арганізацыйна-інструктарскае,
2) бібліятэчнае,
3) масавай палітыка-асьветнай работы.

2. На першы курс бяз іспытаў прымаюцца асобы, якія маюць закончаную сярэднюю адукацыю, а таксама і тыя, што скончылі курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ і ВТНУ.

Усе іншыя павінны трымаць іспыты ў аб'ёме ведаў сярэдняй школы (9-годкі).

3. У палітыка-асьветны інстытут на аддзяленьні: арганізацыйна-інструктарскае і масавай палітыка-асьветнай работы прымаюцца члены і кандыдаты КП(б)Б і КСМ, якія маюць ня менш, як двухгадовы стаж актыўнай партыйнай, камсамольскай, або грамадзкай работы.

На бібліятэчнае аддзяленьне прымаюцца і беспартыйныя з 2-хгадовым стажам грамадзкай работы.

Узрост паступаючых ад 17 да 35 год.

У інстытут ня прымаюцца асобы з заразнымі хваробамі, хворыя поўрастоіяй у клінічнай форме, сухотамі і зусім фізычна слабыя.

4. Паступаючыя ў палітыка-асьветны інстытут павінны падаць на імя раённых і гарадзкіх камісій, што існуюць пры райкомах і гаркомах КП(б)В заяву з паказаньнем аддзяленьня і далучыць наступныя дакументы: 1) аб узросьце, 2) адносінах да службы ў Чырв. арміі, 3) аб асьвеце, 4) аб стане здароўя, 5) аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў, 6) для аднаасобнікаў—адпаведны дакумант аб сельгаспадатку на 1932 г., 7) даведку аб 2-хгадовым стажы (для асоб, скончыўшых датэхнікумы і ФЗВ), 8) характарыстыку мясцовай партыйнай або камсамольскай ячэйкі, 9) анкету, засьведчаную савецкімі або прафэсыянальнымі ўстановамі ці арганізацыямі раённага маштабу, 10) 2 фатаграфічныя карткі.

Дакументы аб асьвеце дасылаюцца толькі ў арыгіналах; формы анк